Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 ЖНІЎНЯ 2009 г.
СЕРАДА
№ 159
(26517)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Свае грошы

КРЭДЫТЫ:

ЗАБАРОНА НА ВАЛЮТУ І НОВЫЯ ПРАПАНОВЫ

З «жыццём у крэдыт» давялося пазнаёміцца асабіста. Як толькі два гады таму пагасіла валютны спажывецкі, узяла льготны жыллёвы. Вяртаць яго мне яшчэ... 39 гадоў. Таму тэму гэту адсочваю невыпадкова. З канца мінулага года на старонках «Звязды» дзялілася сваімі назіраннямі над усімі зменамі на крэдытным рынку краіны. Што тут адбылося новага апошнім часам?

З канца ліпеня ўсе банкі Беларусі перасталі выдаваць крэдыты прыватным асобам у замежнай валюце. За некалькі тыдняў да ўвядзення гэтай нормы некаторыя аўтадылеры разам з банкамі прапанавалі насельніцтву спецпраграмы па крэдытаванні. Напрыклад, у Аўтацэнтры «Атлант-М Сухарава» ў Мінску можна было набыць аўтамабіль у крэдыт пад 13,5 працэнта ў доларах.

— Трэба сказаць, што ў параўнанні з пачаткам года, калі ўсякае крэдытаванне было практычна прыпыненае, рынак пачаў ажываць, — пракаментаваў **PR-менеджар аддзела маркетынгу Атлант-М Аляксандр БАБКО.** — Сёння пра ўплыў забароны на валютныя крэдыты казаць пакуль рана. Самы мінімальны крэдыт у нас — 24 працэнты ў беларускіх рублях. Зразумела, чалавеку няпроста будзе пераарыентавацца на такі крэдыт, калі ён збіраўся ўзяць валютны пад меншыя працэнты.

Прыпыненне выдачы валютных крэдытаў фізічным асобам, за выключэннем індывідуальных прадпрымальнікаў, павінна садзейнічаць абароне і забеспячэнню ўстойлівасці беларускага рубля, патлумачыў Нацыянальны банк, у тым ліку яго пакупной здольнасці і курсу ў дачыненні да замежных валют, а таксама ўмацаванню даверу да нацыянальнай валюты. Нацбанк лічыць, што крэдытаванне насельніцтва ў замежнай валюце мае высокую валютную рызыку і рызыку нявыплаты такіх крэдытаў. Названая норма носіць часовы характар і будзе дзейнічаць да стабілізацыі сітуацыі ў эканоміцы краіны.

Пасля ўвядзення забароны на выдачу валютных крэдытаў на іх месца не паспелі «прыйсці» рублёвыя, таму пералік крэдытных прапаноў значна скараціўся. Напрыклад, па звестках сайта infobank.by, на пачатак жніўня **аўтакрэдытаванне ў беларускіх рублях** прапаноўвалі толькі 9 банкаў. Тэрміны крэдытавання не змяніліся і складаюць ад 3 да 7 гадоў. Сума крэдыту ў большасці банкаў складае 60-80 працэнтаў ад кошту аўто, а працэнтная стаўка ў сярэднім — 23—28 пунктаў.

— Ідэі пра замяшчэнне валютных крэдытаў лунаюць у паветры, аднак пакуль новых прапаноў не шмат, — пракаментаваў сітуацыю фінансавы дарадца benefit.by, — Прычына ў тым, што вельмі дарагія дэпазіты не дазваляюць банкам знізіць стаўкі па крэдытах. Таму апошнім часам можна назіраць паступовы перагляд прапаноў па ўкладах у бок зніжэння ставак.

Што датычыцца **жыллёвага крэдытавання,** то за апошнія два месяцы сітуацыя тут амаль не змянілася, калі не лічыць зніжэння платы за льготныя крэдыты для шматдзетных сем'яў і, зноў жа, адмену валютнага крэдытавання. Беларусбанк прапаноўвае льготныя крэдыты на будаўніцтва жылля пад 1-5 працэнтаў гадавых (у залежнасці ад катэгорыі грамадзян) на 15 гадоў для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і для тых, чыя чарга падышла. Шэраг банкаў (Беларусбанк, Белінвестбанк) прапаноўвае крэдыты па стаўцы ў 14-18 працэнтаў у беларускіх рублях на 15-20 гадоў тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, але чакаць сваёй чаргі не жадае.

На агульных падставах, г.зн. тым, хто не адносіцца да катэгорыі асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, некалькі банкаў (Беларусбанк, БПС-Банк і Белзнешэканомбанк) прапануюць рублёвыя крэдыты пад 25-26 працэнтаў тэрмінам на 15-20 гадоў. Пераплата па іх, напрыклад, на суму ў 40 млн беларускіх рублёў, будзе 75,5-100,5 мільёна.

На рынку **спажывецкага крэдытавання** галоўная навіна — выдача крэдытаў пад 10 працэнтаў гадавых на набыццё тавараў айчыннай вытворчасці. Пакуль гэта мера не выклікала ажыятажнага попыту на беларускія тавары, аднак яна закліканая якраз разгрузіць склады айчынных вытворцаў.

Максімальны памер льготнага крэдыту — 10,5 мільёна беларускіх рублёў. Даецца ён тэрмінам на тры гады пры пакупцы ў безнаяўным парадку пэўнага пераліку тавараў айчыннай вытворчасці. Атрымаць такі крэдыт могуць грамадзяне, сярэднямесячны даход на кожнага члена сям'і якіх не перавышае мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек (гэта прыкладна 377 тысяч беларускіх рублёў на чалавека на канец ліпеня). Самая маленькая пераплата па льготных спажывецкіх крэдытах, згодна з назіраннямі фінансавага дарадцы benefit.by, будзе ў БПС-Банку. Праз тры гады яна складзе менш чым 200 тысяч.

Найбольш выгадныя прапановы па астатніх спажывецкіх крэдытах можна сёння знайсці ў Белагрупрамбанку, Белінвестбанку, БПС-Банку і ў Франсабанку. Працэнтная стаўка — 24-27 пунктаў, сума — ад 1,5 да 10 млн, тэрмін — ад 16 месяцаў да 3 гадоў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Лёс сапраўды ўнікальны, калі жанчына першы раз нараджае адно дзіця, другі раз — двойню, а трэці — тройню. Гэта — пра жыхарку вёскі Перамонт Лёзненскага раёна Ірыну Пацыенку. У Беларусі, бадай, адзіны выпадак. Старэйшы сын Валянцін, 1986 года нараджэння, ужо на сваім хлебе. Сярэднія Любоў і Яўгенія, народжаныя ў 1993-м, пойдуць у 11 клас. Апошнія Марыя, Наталля і Аляксандра, якія сталі сенсацыяй 1999 года, перайшлі ў чацвёрты. Як ні дзіўна званне маці-гераіня Ірына Пацыенка дагэтуль не атрымала, як, дарэчы, не дачакалася і лепшых жыллёвых умоў. Год таму памёр муж Ірыны, але шматдзетная маці спадзяецца на падтрымку дзяржавы.

*НА ФОТАЗДЫМКУ: **Ірына ПАЦЫЕНКА** са старэйшымі і малодшымі дочкамі на парозе свайго дома.*

Ва Урадзе

ЗАМОЖНЫЯ РЭГІЁНЫ — ЗАМОЖНАЯ КРАІНА!

Чаму гэтага не разумеюць кіраўнікі на месцах — аб гэтым гаварылася на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў

Праўда, само пасяджэнне Урада ўчора пачалося з амаль паўгадзіннай затрымкай. Прычына — урад Беларусі гэтымі днямі праводзіць кансультацыі з прадстаўнікамі Міжнароднага валютнага фонду — у Мінск прыбыла дэлегацыя гэтай уплывовай міжнароднай арганізацыі на чале з дырэктарам Еўрапейскага дэпартамента МВФ Марэкам Белькам. Каментуючы вынікі перамоў, **прэм'ер-міністр Сяргей СІДОРСКІ** адзначыў, што работа беларускага Урада ацэньваецца экспертамі МВФ станоўча. «Тая антыкрызісная праграма, якая была ўзгодненая, выконваецца ў поўным аб'ёме, — паведаміў ён. — Мы паглядзелі праграму лібералізацыі беларускай эканомікі, эксперты цяпер вывучаюць гэтыя пытанні і ў хуткім часе зробяць высновы. Імі падтрыманыя рашэнні Прэзідэнта і Урада краіны па павышэнні інвестыцыйнай прывабнасці, пашырэнні магчымасцяў вядзення інвестыцыйнага бізнэсу ў нашай краіне».

Канстатаваўшы гэта, члены Урада прыступілі да абмеркавання вынікаў выканання ў першым паўгоддзі Дзяржаўнай комплекснай праграмы развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў на 2007-2010 гады. І вось тут, на практыцы, як высвятляецца, далёка не ўсё гладка. Дакладвала **намеснік міністра эканомікі Таццяна СТАРЧАНКА,** якая паведаміла, што падрыхтаваны Мінэканомікі праект прадугледжвае выключэнне з праграмы 16 інвестпраектаў у сувязі з адмовай інвестараў ад іх рэалізацыі, адсутнасцю бюджэтнага фінансавання і з-за прызнання прадпрыемстваў банкрутамі. У некаторых выпадках прычыны адмовы носяць аб'ектыўны характар — крызіс у свеце ўсё яшчэ працягваецца, у іншых — цалкам суб'ектыўны: уладны на месцах зацягвалі станоўчае вырашэнне пытання. Без згоды ўрада пераносяцца тэрміны рэалізацыі некаторых інвестпраектаў у малых гарадах. Так, напрыклад, на ТАА «Хоцімская цэгла» ў Магілёўскай вобласці за працяглы час ніяк не могуць зрабіць заключэнне аб прыдатнасці сыравіны для вырабу цэглы, у сувязі з чым не распрацоўваецца бізнэс-план і будаўнічы праект вытворчасці керамічнай цэглы. А тэрмін завяршэння тэхнічнага перааснашчэння «Веткаўскай баваўнапрадзільнай фабрыкі», згодна з планамі, закончыўся яшчэ ў 2008 годзе. Але гэта на паперы. На практыцы ж мясцовыя чыноўнікі просяць прадоўжыць тэхнічнае пераўзбраенне і ў 2010-м!

Яшчэ адна праблема — невыкананне заданняў 2009 года па ўцягванні ў гаспадарчы абарот невыкарыстоўваемай дзяржмаёмасці ў малых і сярэдніх гарадах. Гэты паказчык па выніках першага паўгоддзя склаў толькі 17,5 працэнта ад запланаванай на год колькасці аб'ектаў рэспубліканскай формы ўласнасці і 31,5 працэнта — камунальнай.

У гэтай сувязі прэм'ер-міністр выказаў незадаволенасць тым, як кіраўніцтва Мінэканомікі, улады на месцах займаюцца гэтым пытаннем — без згоды Урада пераносяць тэрміны рэалізацыі некаторых інвестпраектаў у малых гарадах. «Не хочаце будаваць адно — будуйце іншае прадпрыемства. Калі ў малым горадзе будзе новая вытворчасць, значыць, там будуць новыя працоўныя месцы, людзі будуць замацоўвацца ў раёне, гэта надасць ім упэўненасці ў заўтрашнім дні», — сказаў прэм'ер-міністр. А калі новае прадпрыемства эфектыўна запрацуе, чыноўнікам ужо не трэба будзе ўмешвацца ў гэты працэс. Яны павінны даць штуршок, зрабіць усё неабходнае, каб стварыць прадпрыемства і даць працу людзям — у гэтым сутнасць праграмы, а не ў пераносе тэрмінаў, падкрэсліў кіраўнік Урада. «Давайце сёння гэта вырашаць, а не чакаць 2010 года, быццам тады нешта зменіцца само па сабе», — сказаў ён. «Ваша справа — настойваць на выкананні рашэнняў Урада і разбірацца, чаму яны не выконваюцца», — падкрэсліў прэм'ер, звяртаючыся да кіраўніцтва Міністэрства эканомікі.

Таццяна Старчанка таксама адзначыла невысокую прыбытковасць на створаных новых прадпрыемствах у малых і сярэдніх гарадах. Яна нагадала, што ў адпаведнасці з законам аб бюджэце на 2009 год, для стымулявання развіцця прадпрымальніцтва ў малых гарадах падаткі, якія выплачваюцца да 1 студзеня 2011 года ад узносаў створаных арганізацый, цалкам залічаюцца ў мясцовыя бюджэты. Па выніках першага паўгоддзя ў цэлым па рэспубліцы было зарэгістравана 1194 такія арганізацыі, якія выплацілі ў мясцовыя бюджэты 25,7 млрд рублёў падаткаў. «Гэта больш, чым у першым паўгоддзі 2008 года, аднак 40 працэнтаў паступленняў ад новых арганізацый было забяспечана прадпрыемствамі Мінскай вобласці», — канстатавала Т. Старчанка. У цэлым па краіне доля паступленняў ад такіх арганізацый склала толькі 1,3 працэнта. Сапраўды, лічба, якую і каментаваць няма чаго. Тым больш, што, як адзначыў С. Сідорскі, «мы, Урад, пайшлі на тое, каб грошы, якія рэгіёны зарабяць за кошт стварэння малых і сярэдніх прадпрыемстваў у сябе, заставаліся на месцы, ішлі на развіццё саміх гэтых рэгіёнаў. І што яны, мясцовыя ўлады, робяць там, на месцах? Хто-небудзь дасць ацэнку гэтаму?» — задаў рытарычныя пытанні кіраўнік Урада.

І адказы, сапраўды, трэба шукаць, як і даваць ацэнку некампетэнтнасці і бяздзейнасці адказных за сваю справу асобаў. Без гэтага руху не будзе.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Ільготныя экспартныя крэдыты ў Беларусі будуць выдавацца і ў расійскіх рублях

У мэтах удасканалення механізма экспартнага страхавання пералік замежных валют, у якіх у Беларусі выдаюцца экспартныя крэдыты па льготных стаўках, дапаўняецца расійскім рублём. Адпаведны ўказ № 431 падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Дакумент уносіць змяненні і дапаўненні ва ўказ № 534 ад 25 жніўня 2006 года «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў (работ, паслуг)».

Экспартныя крэдыты ў расійскіх рублях будуць выдавацца пад стаўку рэфінансавання, устаноўленую Цэнтрабанкам РФ.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЯШЧЭ ДВА ВЫПАДКІ ГРЫПУ

Міністэрства аховы здароўя пацвердзіла яшчэ два выпадкі заражэння высокапатагенным вірусам грыпу A/H1N1 у дзяцей, якія ў складзе арганізаванай групы выязджалі на аздараўленне ў Вялікабрытанію: зараз яны знаходзяцца ў бальніцы і атрымліваюць адпаведнае лячэнне. Стан іх здароўя медыкі ацэньваюць як здавальняючы. Такім чынам, у Беларусі зарэгістравана ўжо 6 лабараторна пацверджаных выпадкаў інфіцыравання вірусам A/H1N1: адзін — у грамадзяніна КНР і пяць — сярод беларускіх дзяцей, што выязджалі за мяжу на аздараўленне. Медыкі настойліва раяць усім беларускім грамадзянам, якія прыязджаюць з замежжа, пры з'яўленні любых «прастудных» сімптомаў абавязкова звяртацца ў медыцынскія ўстановы і інфармаваць спецыялістаў аб сваёй замежнай вандроўцы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Падрыхтоўка да вучэння «Захад-2009» выйшла на фінішную прамую

Аб гэтым паведаміў журналістам дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Беларусі Юрый ЖАДОБІН.

Чуткі, якія распаўсюджваюць некаторыя СМІ, што вучэнне «Захад-2009» можа не адбыцца, з'яўляюцца толькі чуткамі. «Падрыхтоўка да такіх вучэнняў патрабуе вялікіх часавых і матэрыяльных затрат. У некаторых пытаннях можна сказаць, што вучэнні пачаліся ўжо і падрыхтоўка выйшла на фінішную прамую», — сказаў ён. Юрый Жадобін таксама нагадаў, што ў рамках вучэнняў беларускія разлікі ППА правядуць стрэльбы на расійскім палігоне «Ашулук» (Астраханская вобласць).

«У найбліжэйшы час вучэнне пачнецца ў практычнай плоскасці», — дадаў дзяржсакратар Савета Бяспекі.

Як паведамлялася, у вучэнні прымуць удзел каля 12,5 тыс. чалавек, у тым ліку крыху больш як 1,8 тыс. чалавек прызавуць праз ваенныя камісарыяты. Плануецца задзейнічаць больш як 220 баявых танкаў, каля 470 баявых браніраваных машын, 230 самаходных і буксіруемых артылерыйскіх гармат, мінамётаў і рэактыўных сістэм залпавага агню, а таксама 60 самалётаў і 40 верталётаў. Вучэнне пройдзе ў два этапы, падчас якіх будуць адпрацаваны падрыхтоўка і прымяненне рэгіянальнай групоўкі войскаў Беларусі і Расіі.

БЕЛТА.

«У АПОШНІ МОМАНТ МУЖ ПАСПЯВАЕ ПРЫЕХАЦЬ — І ЖОНКА, ЯКАЯ ПАМІРАЕ, АДПІСВАЕ ЎСЁ ЯМУ...»

Пільнуй сваё!

Архівіст Вольга Бабкова распавядае, пра што пісалі беларусы ў тэстаментах 400 гадоў таму

Чаму чалавек мог раптам перапісаць тэстамент за паўгадзіны да смерці? Каму забаранялася пісаць тэстаменты? Ці махлявалі з тэстаментамі сваякі памерлага? Пра гэта «Звяздзе» распавядае Вольга БАБКОВА, загадчыца аддзела старадаўніх актаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

«ГЭТА ЛІТАРАТУРНЫЯ ТВОРЫ НА ПАРОЗЕ ВЕЧНАСЦІ...»

— Спадарыня Вольга, скажыце, калі ласка, ці вялікі пласт сярод нашых гістарычных дакументаў складаюць тэстаменты?

— Так, дастаткова вялікі. Увогуле, сярод проста агромністай колькасці судовых дакументаў, якія запісаныя ў актавых кнігах, тэстаменты, як мне здаецца, стаяць трошку асабняком. І я б іх вылучыла ў такі асаблівы тып дакументаў, якія з'яўляюцца не толькі натарыяльнымі, дзе дакладна была распісаная маёмасць тэстатара, але таксама і сведчаннямі пра ментальнасць чалавека, пра яго духоўны стан, пра яго светаадчуванне на парозе Вечнасці. І найбольш — пра самога чалавека, пра ягоную асобу.

— Ці можна з гэтага зрабіць выснову, што тэстаменты былі не толькі сухімі дакументамі, дзе размяркоўвалася спадчына, але і больш пашыранымі тэкстамі?

— Тэстаменты, зразумела, сустракаюцца розныя. Адны маглі пісацца за некалькі гадоў да смерці і некалькі разоў рэдагавацца, а іншыя пісаліся за паўгадзіны да смерці, скажам, чалавекам, параненым у двубоі, пры нейкіх нечаканых абставінах. Зразумела, што гэта адбівалася і на змесце тэстамента. Але ўвогуле тэстамент, нягледзячы на тое, што ён мае пэўную прынятую форму, вельмі часта з'яўляецца амаль літаратурным тэкстам. Тэстамент чытаецца не як судовы сухі дакумент, а менавіта як нарматыўны дакумент, які піша чалавек, разумеючы важнасць і істотнасць моманту — моманту развітання з гэтым жыццём і спаткання са светам, у які ён глыбока верыць, але які ёсць таямніцай. Трэба сказаць, што гэта хрысціянскі тып дакумента, і пісаў яго хрысціянін, які верыў у абавязковае з мёртвых устанне, у тое, што чалавечая душа вечная, і што ён мусіць вярнуцца да гэтага жыцця яшчэ раз.

— А як адбываўся сам працэс напісання тэстамента? Чалавек сам пісаў яго і прыносіў для ўключэння ў судовую кнігу ці клікаў якога сакратара?

— Таксама гэта адбывалася паронаму. Адзінае, што можна дакладна сказаць: у актавых кнігах тэстамент з'яўляўся выключна пасля смерці чалавека. Ён мог доўга ляжаць недзе ў куфры ці шуфлядзе, але калі чалавек памірaў, яго сваякі ці даверaныя асобы прыносілі актыкоўваць тэстамент у суд. Таму заўжды можна прасачыць, за колькі часу да смерці чалавек узяўся пісаць тэстамент... А пісаць чалавек мог сам, мог наняць адмысловага пісара — існавалі пэўныя платы за напісанне тэстамента. Але я сустракала выпадак, калі, скажам, Ежы з Завішаў сам правіў ды рэдагаваў тэкст свайго тэстамента, рабіў на палях нейкія папраўкі ўласнай рукой. А часам вельмі хворы чалавек не мог гэта зрабіць, тады ён звяртаўся да іншага.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

ЯК ХУТКА І ВЫГАДНА ПРАДАЦЬ МАШЫНУ Ў КРЫЗІС?

Выпрабавана на сабе

ВА ЎЧАРАШНІМ НУМАРЫ МЫ СПРАБАВАЛІ ПАРАЦЬ, ЯК НЕ ПАДМАНУЦЦА, КУПЛЯЮЧЫ Б/У АЎТО, А СЁННЯ — ПАСПРАБУЕМ ЯГО ПРАДАЦЬ.

Нічога не атрымоўваецца? Рынак ужываных аўтамабіляў перанасычаны настолькі, што горкімі слёзамі аблiваюцца нават прафесійныя перагоншчыкі. Карэспандэнт «Звязды» высвятляў, як выгадна і хутка прадаць аўтамабіль.

Сваё моладзевае «Рэно Кліа» 2000 года выпуску я набыў акурат год таму. Памяняў задняе шкло з танаванага на звычайнае, адрамантаваў падвеску, уклаў грошы у капрызны бензінавы рухавік аб'ёмам 1200 см³. У выніку машына мне абышлася ў 5200 долараў ЗША. Прыкладна столькі ж маё аўто каштавала на рынку.

Што казаць, маё «Рэно Кліа» сёння ў ідэальным стане. Вось толькі кошт ужо ў першыя месяцы фінансавага крызісу знізіўся на 35 %. І сёння, згодна з рэкламнымі абвесткамі, машына каштуе ад 3600 да 4000 долараў ЗША. Як высветлілася, нават за такія грошы прадаць яе — вялікае шчасце. Але я, атрымаўшы рэдакцыйнае заданне, паспрабаваў зрабіць гэта самымі надзейнымі спосабамі.

ПРАЗ АЎТАРЫНАК

Яшчэ год таму аўтамабілі з двух галоўных аўтарынкаў краіны — сталічных «Ждановічаў» і «Малінаўкі» — набываліся гужам. Сёння і кошты, і попыт на машыны фантастычна скараціліся.

— На рынак сваю машыну нават не заганяй, — сустрэўся я на «Ждановічах» са знаёмым перакупшчыкам-азербайджанцам Агісметам. *— У суботу за заезд сюды аддасі 80 тысяч рублёў, у нядзелю — 40 тысяч. А шанц прадаць машыну — адзін з пятнаццаці. Многія перагоны згалелі, сышлі з рынку. Нават каўказцы, якія жылі гэтым доўгія гады, сыходзяць. Я таксама шукаю сабе новую працу — напэўна, буду ахоўнікам на дыскатэцы.*

На аўтарынку мяне і сапраўды чакала поўнае фіяска. Аказваецца, за 4500 долараў ЗША можна лёгка набыць машыну, значна вышэйшую класам за маё «Рэно Кліа». За такі кошт выстаўляюцца дызельныя «Сітраены Ксантыя». Папулярныя і прасторныя «Пежо 406» можна імгненна знайсці за 4900 долараў ЗША. А за «Рэно Кліа», на тры гады маладзейшае за маё і з лепшым рухавіком, на аўтарынку прасілі ўсяго чатыры тысячы долараў ЗША. Не, такую канкурэнцыю мне не вытрымаць. Выпіўшы валяр'яначкі, я паехаў падаваць рэкламную абвестку ў інтэрнэт.

ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

Гэта самы мабільны і зручны спосаб прадаць машыну. А галоўнае — бясплатны.

Я падаў абвесткі на два самыя папулярныя парталы ў краіне па продажы аўто — «Аўтамалінаўка» (www.av.by) і «Аўтабізнэс» (www.abw.by). Распісаў, што машына мая ў ідэальным стане, нібыта толькі з канвеера, не патрабуе фінансавых укладанняў. Хоць насамрэч праз паўгода трэба будзе памяняць счапленне (не менш за 150 долараў). Кошт выставіў у 4100 долараў ЗША.

— Правільна-правільна, наконт ідэальнага стану я згодны, шукай лоха, — раіў мой знаёмы 27-гадовы аўтагандляр Сярожа з рынку «Малінаўка». *— А вось з коштам — не смяшы маю сівую галаву. Хочаш хутка прадаць машыну? Выстаўляй вельмі, вельмі прывабны кошт. І бажыся, што машына звышэканамічная — ездзіць амаль што на паветры.*

Пачакаўшы чатыры дні, цягам якіх мне ніхто нават не патэлефанаваў, я знізіў кошт да 3750 долараў ЗША.

Было два тэлефанаванні. Першай дзяўчыне была не даспадобы механічная каробка перадач.

— Хачу аўтамат, каб не стамлялася ў заторах, — патлумачыла першая кліентка.

Бліжэй да выхадных глядзець на мой тавар прыехала маладая пара.

— Фі, — скрывілася жонка, убачыўшы драпіну на левым крыле. — Хачу, каб усё было ідэальна...

(Заканчэнне на 8-й стар.)



Каб прадаць сёння машыну, некаторыя ад адчаю ідуць на хітрыкі вулічных жабракоў.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

НА ГЭС ЗНАЙШЛІ ЯШЧЭ ДВА ЦЕЛЫ



Выратавальнікі знайшлі целы яшчэ двух загінулых у выніку аварыі на Саяна-Шушанскай ГЭС. Іх асобы ўжо вызначаныя. Па апошніх звестках, у выніку аварыі загінуў 71 чалавек, чатыры чалавека зніклі без вестак. Былі выратаваныя 14 працаўнікоў ГЭС.

Раней у МНС паведамілі, што міністэрства паступова скарачае сваю групоўку сіл і сродкаў, задзейнічаных на ГЭС. Чакаецца, што супрацоўнікі МНС пакінуць станцыю да 30 жніўня.

ІЗРАІЛЬСКІЯ ВПС РАЗБАМБІЛІ ТУНЭЛЬ

Ізраільскія ВПС разбамбілі тунэль, які праходзіў праз мяжу паміж Сектарам Газа і Егіптам.

У выніку загінулі тры палесцінцы. У ізраільскіх узброеных сілах сказалі, што бамбёжка стала адказам на дзеянні палесцінскіх баевікоў, якія абстралялі тэрыторыю Ізраіля ракетамі. Колькасць гэтых тунэляў вылічаецца сотнямі. Яны выкарыстоўваюцца ў асноўным для правозу кантрабанды, якая ва ўмовах ізраільскай блакады мае для Сектара Газа вельмі вялікае значэнне.

ПАЖАРЫ ЛІКВІДАВАНЫЯ

У грэчаскіх пажарных атрымалася ліквідаваць большасць ачагоў лясных пажараў, якія пагражалі Афінам. Хоць распаўсюджванне агню атрымалася спыніць, пажарныя будуць знаходзіцца ў стане павышанай гатоўнасці на выпадак узнікнення новых узгаранняў.

ПАДЧАС ЭКСКУРСІІ ПАТАНУЛА ДЗІЦЯ

У Пецярбургу падчас экскурсіі на «Аўрору» зваліўся за борт і патануў падлетак з Карэі.

Хлопчык гадоў дзесяці, які прыляцеў з Паўднёвай Карэі з бацькамі, не паспеў нават узысці на судна, перакуліўся праз парапет набярэжнай і зваліўся ўніз. Бацькі кінуліся ў раку ўслед за дзіцем. Вада ў Няве халодная і цёмная, а пад «Аўрорай» глыбока. Мусіць, таму ніхто больш не скокнуў. Нават з борта крэйсера, хоць там праходзяць службу ваенныя маракі і статут загадвае ім ратаваць чалавека за бортам.

ВОСТРАЎ ПА КОШЦЕ КВАТЭРЫ

Пара з Германіі выставіла на продаж маленькі прыватны востраў Талоў плошчай каля двух гектараў.

Ён размешчаны ў Балтыйскім моры непадалёку ад вострава Руген. Цяпер ім валодаюць сужэнцы Фоігт, Манфрэд і Інге. За Талоў яны просяць няшмат, усяго 150 тысяч еўра (каля 212 тысяч долараў) — прыкладна столькі ж каштуе кватэра на ўскраіне Гамбурга. Аднак такі прымальны кошт абумоўлены, у першую чаргу, тым, што будаўніцтва на востраве забароненае. Калі ж дазвол будзе атрыманы, кошт вострава адразу падскочыць у два разы.

ВЫБУХОВЕЦ З БЕНЗАПІЛОЙ

Паліцыя арыштавала 17-гадовага жыхара Каліфорніі, які падарваў самаробныя бомбы ў адной са школ штата. Усяго да пояса маладога чалавека было прымацавана не менш за дзесяць выбуховых прылад, але спрацавалі толькі дзве, прычым сур'ёзных калецтваў ніхто не атрымаў. Пры сабе выбуховец-аматар меў меч і бензапілу.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.08.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 828,00
▼ 1 еўра	4 036,69
1 латвійскі лат	5 764,37
1 літоўскі літ	1 169,61
1 чэшская крона	158,94
1 польскі злоты	985,19
▲ 1 расійскі рубель	89,65
1 украінская грыўня	346,36

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Цэнтрабанк РФ

USD	31,5437
UAH	38,7039
1000 BYR	11,1541
EUR	45,0476

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ЗНЕШНІ ГАНДАЛЬ: «КРЫТЫЧНЫ ПУНКТ» ПЕРААДОЛЕНЫ?

Як заўважыў намеснік старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Віктар МІХНО, можна канстатаваць, што па вынiках першага паўгоддзя аб'ёмы знешняга гандлю значна зменшыліся.

За студзень—чэрвень на экспарт было пастаўлена прадукцыі на 9 мільярдаў долараў (52,3 працэнта ў параўнанні з такім жа перыядам летась), а імпарт склаў $12,9 млрд. (66,6 %). Атрымалася адмоўнае сальдо ў памеры $3,9 млрд. Паводле інфармацыі Віктара Міхно, адпаведная сітуацыя характэрная для шэрагу іншых краін. Напрыклад, аб'ём продажу на знешнім рынку Расіі і Украіны зменшыўся на 47 працэнтаў, Казахстана — на 51, Германіі — на 33,4, Польшчы — на 32, Літвы — на 31, Латвіі — на 26,4 %. З-за сусветнага крызісу за першае паўгоддзе ў параўнанні з такім жа перыядам летась у Беларусі пастаўкі грузавых аўтамабіляў «змінусавалі» на 85,1 працэнта, металаапрацоўчых станкоў — на 70,7, рухавікоў унутранага згарання — на 68,9, трактароў — на 42,2 %. Адпаведна, скарачаліся закупкі па імпарце сыравіны і камплектавых.

Сёлета істотна зменшыліся цэны на шэраг тавараў, што пастаўляліся на экспарт і завозіліся з-за мяжы. Больш чым удвая — на нафтапрадукты, у 1,7 раза — на шыны, у 1,5 раза — на малочную прадукцыю. У выніку нават рост на 18,2 % фізічных аб'ёмаў паставак прадуктаў харчавання (у першую чаргу за кошт павелічэння продажу розных відаў малочнай прадукцыі) не прывёў да адпаведнага павелічэння грашовай выручкі ад іх рэалізацыі. Увогуле цэны на гэтыя тавары на знешнім рынку зменшыліся амаль на чвэрць. Як запэўніў Віктар Міхно, сітуацыю на знешнім рынку ўдалося ўзяць пад кантроль. Найбольш складанымі былі студзень і люты, калі назіралася падзенне. А пасля адзначаецца няхай нязначны, але ўстойлівы прырост. Гэтая тэндэнцыя будзе працягвацца і надалей, напэўна, можна лічыць, што «крытычны пункт» усё ж пераадолены. У лiпені ў параўнанні з папярэднім месяцам зменшыліся аб'ёмы складскіх запасаў прадукцыі — з 94 да 88,3 працэнта сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці. Як адзначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення статыстыкі гандлю Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена БАРУШКА,** металургічная прадукцыя інтэнсіўна прасоўваецца на рынкі афрыканскіх дзяржаў (такіх як Гамбія, Гана, Уганда, Эфіопія).

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Ну і ну!

НАСТАЛЬГІЯ ПА... МАЛЯНКОЎСКАЙ ШКЛЯНЦЫ

Зайшоў неяк днямі ў краму «Крышталь» на сталічным праспекце Незалежнасці. І выпадкова ўвагу прыцягнуў сувенірны набор пад назвай «Настальгія». Што б вы думалі ў ім было? На першы погляд, шэсць звычайных гранёных шклянак па 250 грамаў!

Памятаеце, у савецкія часы такія былі літаральна ва ўсіх дамах і кватэрах, іх яшчэ называлі малянкоўскімі. Ды і цяпер, хатнія гаспадыні, у каго яны захаваліся, выкарыстоўваюць іх для розных кулінарных патрэбаў: адмераць які прадукт або цеста для пельменяў ці варэнікаў шырокай адкрытай часткай колцамі нарэзаць. Карацей, шклянкі як шклянкі. Хіба толькі ўпакаваныя ў прыгожую прадаўгаватую скрыначку, выкладзеную знутры, ярка-чырвоным, як падалося, шоўкам (нібы тыя ўзнагароды ў ордэнскіх «скарбоначках»). Ды цана той «Настальгіі» — 162 800 рублёў (гэта прыкладна 55 долараў)! Неяк імгненна пачаў прыгадваць: недзе на гарышчы бацькоўскай хаты такіх гранёных «настальгій» хопіць на некалькі набораў. Нават калі давядзецца колькі грошай выдаткаваць на шаўковую матэрыю ды прыгожыя скрыначкі, усё адно атрымліваецца, што адну гранёную шклянку можна будзе прадаць тысяч за 25. Нішто сабе грошы за тавар, набыты некалі літаральна за капейкі! Толькі каму прадаць, каму не хапае такой «Настальгіі»?!

Работнікі крамы, праўда, хутка апусцілі, як кажуць, з нябёсаў. «Ды вы што, гэта ж хрустальныя шклянкі, толькі стылізаваныя пад звычайныя гранёныя. Таму і каштуюць адпаведна. Мы іх толькі другі раз ад адной фірмы і бяром — па адным наборы. Вось апошні так і стаіць у вітрыне». Сапраўды, калі задумацца: хто можа набыць такі сувенірны набор, нават з хрустальнымі шклянкамі? На мой погляд, або іншаземец у якасці своеасаблівага «прыкола», або па гэтай жа прычыне — нябедныя суайчыннікі свайму сябру на якое свята.

Зразумела, мы не маглі не пагаварыць з прадстаўнікамі фірмы-пастаўшчыка «Настальгіі». Яны пацвердзілі здагадку наконт патэнцыйных пакупнікоў: або замежнікі, або свае хлопцы-«прыкалісты». Прычым, апошнія сустракаюцца часцей. А чаму ўвогуле з'явілася такая ідэя? Тут найперш можна пасмяяцца з арыгінальнай задумы ці пазайздросціць прадпрымальніцкай жылцы?

— Як кажа наш дырэктар, мы ўсе выйшлі з таго часу. Ён у нас увогуле крыніца ўсіх ідэй. Вось і са шклянкамі — ездзіў у Расію на завод па дазвол на выпуск хрустальнага посуду. Тое прадпрыемства дагэтуль вырабляе гранёныя шклянкі. Вы ж ведаеце, чаму яны называюцца «малянкоўскімі»? Некалі маршал Малянкоў ухваліў выраб такога посуду. За савецкім часам ён каштаваў 14 капеек. Але ў нас шклянкі хрустальныя, што пацвярджаецца спецыяльным укладышам у скрыначкі, — патлумачылі нам работнікі фірмы, што займаецца выпускам падарункаў і сувеніраў. — Пасля атрымання ад расіян дазволу мы замовілі партыю хрустальных шклянак на адным з беларускіх прадпрыемстваў, зрабілі спецыяльную ўпакоўку, стылізаваную пад тыя часы. Яшчэ пэўны запас ёсць. Прадаём «Настальгію» не толькі ў сталіцы, былі пастаўкі, скажам, у Магілёў, у Гродна. Тавар пакрысе, але разыходзіцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА

Вынаходнікамі шклянкі лічацца Вера Мухіна і Казімір Малевіч. Гаворыць, што яны доўга працавалі над эскізамі, нават спрачаліся, колькі на посудзе павінна быць граняў і якімі павінны быць памеры.

Малянкоў у 1953 годзе распрацаваў змяншэнню падаткаў з вяскоўцаў, за што атрымаў павялічэнне да сябе. Нават пасля таго, як быў пазбаўлены пасады Старшыні Савета Міністраў. Аднак гранёная (10 граняў) шклянка з дастаткова тоўстымі сценкамі і з паяском па версе (250 грамаў — малянкоўскі, у шклянку без паяска змяшчалася толькі 200 грамаў) атрымала сваё паважлівае найменне ў сувязі з масавым увядзеннем у эксплуатацыю пунктаў грамадскага харчавання з пачатку 1950-х гадоў: гарадскіх, школьных, студэнцкіх, заводскіх і калгасных сталовак, якія працавалі ў дзве, а часам і ў тры змены. Значнаму распаўсюджванню малянкоўскай шклянкі ў краіне садзейнічала і спыненне ў хрушчоўскія часы продажу ў палатках гарэлкі на разліў, а ў крамах — «чакушак» (250 грамаў) і «мярзаўчыкаў» (125 грамаў). Гаворыць, адсюль і пайшоў рытуал распіцця паўлітровай бутэлькі гарэлкі на траіх.

Масавая вытворчасць гранёных шклянак стымулявалася ў тыя ж хрушчоўскія часы адкрыццём піўных аўтаматаў, дзе разам з пенным напоем прадаваўся і партвейн, што аўтаматычна разліваўся ў шклянкі.

Гранёная шклянка — малянкоўская — у пэўным сэнсе з'яўляецца сімвалам мінулага савецкіх часоў з пачатку 1950-х гадоў і да канца XX стагоддзя.

Беларускі бок зняў абмежаванні па ўзросце і колькасці выездаў дзяцей на аздараўленне ў Германію

Прэзідэнт Беларусі сваім указам адобрыў заключэнне шляхам абмену нотамі міжурадавага пагаднення з Федэратыўнай Рэспублікай Германія, якое ўносіць змяненне ў дзейнае з 11 лютага 2009 года пагадненне аб умовах аздараўлення няпоўнагадовых грамадзян Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Германія. Дзеці ва ўзросце ад 7 да 18 гадоў змогуць выязджаць на аздараўленне ў ФРГ за кошт замежнай бязвыплатнай дапамогі без абмежавання колькасці такіх выездаў.

Спрошчаны мытны кантроль для рэзідэнтаў СЭЗ Беларусі

Для рэзідэнтаў СЭЗ Беларусі вырашаны асобныя праблемныя пытанні ў мытнай сферы. Адпаведныя дапаўненні ва ўказы ад 9 чэрвеня 2005 года № 262 і ад 31 студзеня 2006 года № 66 уносіць указ Прэзідэнта Беларусі № 430. Дакумент накіраваны на ўдасканаленне мытнага заканадаўства і вырашэнне праблемных пытанняў, што ўзнікаюць у рэзідэнтаў свабодных эканамічных зон (СЭЗ).

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Спорт-тайм

СЕРАБРО Ў МОТАБОЛЕ

Зборная Беларусі стала сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы па мотаболе. У фінальным матчы ва Украіне нашы суайчыннікі прайгралі камандзе Расіі з лікам 1:6. Адзіны гол у складзе беларусаў забіў Антон Уласавец. Ён і стаў найлепшым бамбардзірам першынства, забіўшы 18 мячоў. У паядынку за бронзу французы абгулялі немцаў — 9:5.

«НЁМАН» ПЕРАМАГАЕ ДОМА

Хакеісты гродзенскага «Нёмана» сталі пераможцамі традыцыйнага турніру памяці былога кіраўніка Гродзенскай вобласці Аляксандра Дубко, які нямала зрабіў для развіцця хакея ў рэгіёне. У фінальным паядынку «Нёман» з лікам 4:2 перамог салігорскі «Шахцёр», які з'яўляецца фарм-клубам мінскага «Дынама». Усяго ў мемарыяле Аляксандра Дубко ўдзельнічалі 4 каманды.

ТЭСТАСТЭРОНУ ЦЕРАЗ КРАЙ?

Буйным скандалам завяршыўся адзін з матчаў чэмпіянату Паўночнай Асеціі паміж камандамі «Ардон-2004» і цхінвальскім «Спартаком». Убачыўшы перад сабой жоўтую картку адзін з гульцоў каманды гаспадароў пачаў высвятляць адносіны з арбітрам і моцна ўдарыў яго па твары. У выніку суддзя быў шпіталізаваны з пераломам сківіцы.

Скандальны інцыдэнт адбыўся ў берлінскім клубе ў нядзелю раніцай. Лёгкаатлеты, якія прымалі ўдзел у чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы, хацелі трапіць у клуб, аднак ахоўнікі іх не пусцілі. У выніку ў ахоўнікаў паляцелі бутэлькі, пачалася бойка, былі параненыя. Шэсць спартсменаў былі арыштаваныя, іх імёны не называюцца па нямецкіх законах. Вядома толькі, што паліцыя арыштавала амерыканца, трох лёгкаатлетаў з Багамскіх астравоў і двух кубінцаў.

Абзац

◢ На арганізаваныя перавозкі школьнікаў і студэнтаў дзённай формы навучання ў цягніках прыгарадных маршрутаў Беларускай чыгункі пачнуць дзейнічаць зніжкі. Гэта прадугледжана пастановай Мінэканомікі № 137. З 1 кастрычніка па 30 красавіка ўключна на арганізаваныя перавозкі груп навучэнцаў установу адукацыі, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй агульнай адукацыі дзённай формы навучання, колькасцю ад 6 да 24 чалавек даецца зніжка ў памеры 10 %, колькасцю 25 чалавек і больш — 15 %.

◢ **У Маладзечанскім раёне МАЗ пераехаў памочніка камбайнера, што спаў на саломе. Надзвычайнае здарэнне адбылося апоўдні на полі паблізу вёскі Вязынка. 35-гадовы вадзіцель СВК імя Я. Купалы, жыхар гарадскога пасёлка Радашковічы, наехаў на 19-гадовага памочніка камбайнера, які спаў у валку саломы. Хлопец з пераломаві абедзвюх ног быў дастаўлены ў бальніцу.**

◢ Буйную партыю малдаўскага віна затрымала міліцыя ў Мінскім раёне. Беларускай фірмай была закупленая партыя знакамітага віна «Букет Малдавіі» ў колькасці 16 тыс. 200 бутэлек. Аўтамашына на законных падставах давезла прадукцыю з Малдовы да беларускай мяжы. Заставалася толькі перагрузіць тавар у іншую фуру, пераафармiць транспартныя накладныя і завезці на адзін з мінскіх складоў. Аднак беларускія камерсанты вырашылі эзканоміць на арэндзе транспарту. У выніку машына была затрыманая, віно агульным коштам амаль Br67 млн канфіскаванае.

◢ **Нелегальнага мігранта, грамадзяніна Узбекістана, затрымалі беларускія памежнікі ў Белавежскай пушчы. 38-гадовы чалавек патлумачыў свой нелегальны пераход мяжы з Польшчы ў Беларусь тым, што страціў у Польшчы працу, згубіў дакументы і меў намер атрымаць у Беларусі статус бежанца. Парушальнік затрыманы для наступнага разбору сітуацыі.**

Поўны абзац

◢ Бацька чэмпіёнкі свету па плаванні зрабіў на сваёй лысіне татуіроўку з вынікам дасягнення дачкі. Перад пачаткам першынства планеты бацька сербскай плыўчыхі Надзі Хігл паабяцаў, што калі яна праплыве 200 м брасам хутчэй чым за 2 хвіліны 22 секунды, ён зробіць татуіроўку на сваёй галаве. У фінальным заплыве Надзя паказала вынік 2 хвіліны і 21,62 секунды, устанавіўшы тым самым рэкорд Еўропы. Адразу пасля вяртання з Рыма бацька зрабіў сабе абяцаную татуіроўку.

◢ **Месца ў склепе побач з Мерылін Манро на могілках Westwood Village Memorial Park у Лос-Анджэлесе прададзена на інтэрнэт-аўкцыёне за $4,6 млн. Імя пераможцы пакуль не называецца.**

◢ Сямейная пара, што адпачывала ў канадскім нацыянальным парку Банф, вырашыла сфатаграфавацца на фоне маляўнічага пейзажу. Для гэтага яны наладзілі фотакамеру і выставілі таймер, пасля чаго прыселі на камянях. Нечакана, проста перад аб'ектывам, зацікавіўшыся гукам таймера, выскачыла вавёрка і трапіла ў самы цэнтр кадра. Такі забаўны кадр застанецца на памяць адпачывальнікам на ўсё жыццё.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Наименование предмета аукциона	Государственное имущество и право заключения договора аренды земельного участка
Местонахождение недвижимого имущества	Брестская область, г. Лунинец, ул. Красная, д. 179б
Продавец недвижимого имущества	РУП «Полесьеэлектромаш», тел. 8 (01647) 2 67 09
Сведения о предмете аукциона	Государственное имущество включает в себя: капитальное строение (склад, общая площадь 225,4 кв.м 1эт. кирпичное, 1985 г.п., имеется электроснабжение, крыша – шифер, фундамент – бетонный) инв. № 133/С-17351, капитальное строение (ограждение подсобного хозяйства жел. бет. протяженностью 465 м, с двумя воротами,) инв. № 133/С-17362, капитальное строение (свинарник на 300 голов, 1 эт., 1994 г., панельное, общая площадь 1100,3 кв.м, фундамент бетонный, крыша – шифер, электроснабжение) инв. № 133/С-13313, капитальное строение (свинарник на 100 голов, общая площадь 576,5 кв.м, 1 эт., кирпичное, 1985 г.п., фундамент – бетонный, крыша – шифер, электроснабжение, водопровод, канализация) инв. № 133/С-17401, капитальное строение (трансформаторная подстанция ТП-740, общая площадь 44,8 кв.м, 1985 г.п., кирпичное, 1 эт., с передаточными устройствами: ВЛ-10Кв(опора № 1-опора № 4), КЛ-10кВ (опора № 4–ТП740), КЛ-0,4кВ(ТП740-здА1/к), КЛ-0,4кВ(зд.А1/к-зд.В1/к) инв. № 133/С-17363), незавершенное законсервированное капитальное строение (бытовые помещения свинарника, общая площадь 89,4 кв.м, 1 эт., степень готовности 63 %) инв. № 133/U-16649. Земельный участок площадью 1,4463 га, срок аренды – 99 лет.
Начальная цена единого предмета аукциона, руб.	545 665 374
Сумма задатка, руб.	54 566 500
Организатор аукциона	**Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11 тел.: (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 12 63, 23 44 78 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by**

Аукцион состоится **29 сентября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе представляются:

Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество» с документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642902530005 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения – по 28 сентября 2009 г. включительно;

негосударственным юридическим лицом Республики Беларусь, индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

при подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Участник, ставший победителем аукциона (претендент на покупку), обязан: подписать протокол аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок организации и проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404,405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 28 сентября 2009 года включительно.

Уважаемые акционеры ОАО «Паритетбанк»!

7 СЕНТЯБРЯ 2009 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ БАНКА В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ МЕТОДОМ ОПРОСА С ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. О процедурных вопросах.
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.

Собрание проводится по адресу: г. Минск, ул. Гамарника, 9/4, комн. 306.

Бюллетени для заочного голосования и другие материалы к собранию участники собрания могут получить по указанному адресу с 31 августа по 1 сентября 2009 года с 9.00 до 13.00.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть возвращены не позднее 3 сентября 2009 года по месту их выдачи, дата подсчета голосов – 4 сентября 2009 года.

Телефон для справок: 288 49 43.

ОАО «Паритетбанк», Лицензия на осуществление банковской деятельности НБРБ от 27.10.2006 г. № 5, УНП 100233809.

В публикации годового баланса ЗАСО «ТАСК» за 2008 год (газета «Звязда» № 47 от 13.03.2009 г.) **в колонке ПАССИВ в строках:**

- кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования следует читать: **540556,10**
- депо премий по рискам, переданным в перестрахование следует читать: **111,10**

УНП 100003006

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «КОПЫЛЬСКИЙ МАСЛОСЫРЗАВОД» КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже *имущества Столбцовского производственного участка ОАО «Копыльский маслосырзавод»,* расположенного по адресу: *г. Столбцы, ул. Свердлова, 3,* в составе зданий: производственное здание, об. пл. 2919,0 кв.м, производственно-вспомогательный цех, об. пл. 423,0 кв.м, здание котельной, об. пл. 261,5 кв.м, здание компрессорной, 201,7 кв.м, здание прачечной, об. пл. 109,6 кв.м, автогараж, об. пл. 156,3 кв.м, здание моечной автомолцистерн, об. пл. 493,4 кв.м, здание ТП 27, об. пл, 60,8 кв.м, воздушная компрессорная, об. пл. 38,2 кв.м, *сооружений:* башня водонапорная, ограждение вокруг завода, *передаточных механизмов:* кабельные сети к силовому оборудованию, трасса газовая производственная 500 АЧ, сети связи воздушные, сети электроосвещения, сети канализационные, сети паропроводные, сети канализационные чугунные, а также *оборудования* и иного имущества согласно списку. Начальная цена с НДС (снижена) – 2 448 172 059 бел. руб. Под обслуживание объектов недвижимости сформировано два земельных участка об. пл. 0,7471 га; 0,0876 га. Рядом с участком имеется ж/д ветка Брест–Минск. Задаток 100 000 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.09 г. Аукцион состоится **08.09.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.09.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел. (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 30 сентября 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Целевое назначение	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	ул. Ленинская (р-н общежития УО «МГУ им. А.А. Кулешова»)	0,0023	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли	740100000004003175	228000	21000
№ 2	ул. Б. Бирули (р-н ж.д. № 14)	0,0023	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли	740100000001005094	114000	10000
№ 3	пр-кт Пушкинский (р-н ж.д. № 40б)	0,0042	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли	740100000006002432	258000	23000
№ 4	б-р Непокоренных (р-н ж.д. № 76)	0,0011	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли	740100000005004131	85000	8000
№ 5	б-р Непокоренных (р-н ж.д. № 79)	0,0039	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли	740100000005004134	300000	27000
№ 6	ул. Симонова (р-н СТО «Березина-Лада»)	0,0038	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли	740100000005004133	168000	15000
№ 7	ул. Симонова (р-н ж.д. № 33)	0,0038	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли	740100000005004132	227000	20000
№ 8	ул. Мовчанского (р-н магазина № 5)	0,0029	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового павильона	740100000006002434	151000	14000
№ 9	ул. Крупской (р-н ж.д. № 184)	0,0096	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового павильона (№1)	740100000002005144	430000	39000
№ 10	ул. Крупской (р-н ж.д. № 184)	0,0096	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового павильона (№2)	740100000002005145	430000	39000
№ 11	б-р Непокоренных (р-н ж.д. №№ 8, 10)	0,0032	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового павильона	740100000005004141	237000	21000
№ 12	ул. 30 лет Победы (р-н ж.д. № 33)	0,0104	до 1.06.2010	установка и обслуживание павильона	740100000002000327	703000	63000
№ 13	ул. 30 лет Победы (р-н ж.д. № 26)	0,0201	до 1.06.2010	установка и обслуживание магазина	740100000002000328	1357000	122000
№ 14	ул. Первомайская, ост. «Завод «Строммашина»	0,0066	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000004002759	581000	52000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

3) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная (общая) сумма затрат составляет 13 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 24.09.2009 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 28 сентября 2009 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Крупской,ост. «Торговый центр «Крыніца»	0,0009	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000002005137	50 000	5 000
№ 2	улица Островского, ост. «Ресторан «Ясень» (от центра)	0,0014	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№1) в остановочном павильоне	740100000005004135	97 000	9 000
№ 3	улица Островского, ост. «Ресторан «Ясень» (от центра)	0,0018	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне	740100000005004136	125 000	12 000
№ 4	улица Островского, ост. «Ул. Островского» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне	740100000005004121	89 000	8 000
№ 5	улица Островского, ост. «Ул. Островского» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне	740100000005004122	89 000	8 000
№ 6	улица Островского, ост. «Ул. Островского» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 3) в остановочном павильоне	740100000005004123	89 000	8 000
№ 7	улица Островского, ост. «Ул. Островского» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 4) в остановочном павильоне	740100000005004124	89 000	8 000
№ 8	проспект Пушкинский, ост. «Универмаг «Октябрьский» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне	740100000005004125	93 000	9 000
№ 9	проспект Пушкинский, ост. «Универмаг «Октябрьский» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне	740100000005004126	93 000	9 000
№ 10	проспект Пушкинский, ост. «Универмаг «Октябрьский» (от центра)	0,0011	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 3) в остановочном павильоне	740100000005004127	85 000	8 000
№ 11	проспект Пушкинский, ост. «Универмаг «Октябрьский» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 4) в остановочном павильоне	740100000005004128	93 000	9 000
№ 12	проспект Пушкинский, ост. «РУДМАП «Автопарк № 1»	0,0015	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 1) в остановочном павильоне	740100000005004776	81 000	8 000
№ 13	проспект Пушкинский, ост. «РУДМАП «Автопарк № 1»	0,0014	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне	740100000005004777	75 000	7 000
№ 14	улица Симонова, ост. «Гребеневский рынок» (в центр)	0,0015	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005004130	90 000	8 000
№ 15	улица Симонова, ост. «Поликлиника № 8» (в центр)	0,0015	до 1.06.2010	Установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне	740100000005004140	111 000	10 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

3) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная (общая) сумма затрат составляет 7 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») **по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 22.09.2009 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

26 жніўня 2009 г. № 28 (180)

ПРАШУ СЛОВА!

ВЯСКОВАЯ ЦІ ГАРАДСКАЯ?

Дазвольце ўзняць на вашых старонках актуальную праблему. Піша вам жыхарка гарпасёлка Любча, што ў Навагрудскім раёне. Сутнасць у тым, што жыхары нашага мястэчка не ведаюць, да каго сябе адносіць — да гараджан ці да вясковых жыхароў? Мабыць, і ўлады гэтага не ведаюць. Доўгі час наш пасёлак быў населеным пунктам гарадскога тыпу. Але вытворчыя прадпрыемствы, якія дзейнічалі на тэрыторыі пасялковага савета (хлебакамбінат, каўбасны цэх, цэх напояў) перасталі існаваць. Цяпер гэта «мёртвыя» аб'екты, якія глядзяць на белы свет сваімі чорнымі аконнымі праёмамі, наводзяць жах на мясцовых жыхароў і, мабыць, не зусім разумеюць безгаспадарлівасці сваіх уласнікаў.

Тэарэтычна гарадскім населеным пунктам лічыцца населены пункт, у якім пражываюць каля дзвюх тысяч чалавек, а нас разам з жыхарамі навакольных вёсак — крышачку больш. І мы — гарадскія жыхары! Менавіта дзякуючы нашай гарадской прыналежнасці ў нас узнікаюць пэўныя праблемы і на працоўным месцы. Я працую ў сярэдняй школе, дзе раней навучаліся каля 290 вучняў. У гэтым годзе школа выпусціла 5 класаў, з іх два 9 штрых-класы, два 9-я і адзін 11 штрых-клас. Колькасць класа-камплектаў паменшылася, зразумела, што паменшылася і колькасць гадзін па прадметах, таму многія педагогі атрымалі, згодна з папярэдняй тарыфікацыяй, па 9, 13, 16 гадзін нагрузкі па сваіх дысцыплінах. А калі б наша школа лічылася сельскай, то і камплектнасць у класах магла быць іншая. Зараз у нашых класах навучаецца па 15—20 і нават больш вучняў. У папярэднім годзе былі класы, дзе навучалася па 10—15 вучняў, але можа здарыцца, што паралелі будуць аб'яднаныя. Затое ў вясковых школах у класе могуць навучацца па два, чатыры, пяць, шэсць, сем вучняў. Ды яшчэ і настаўнікі атрымліваюць 20-працэнтную надбаўку за складныя ўмовы працы. А якія ж яны складаныя?

У нашай школе фінансісты забараняюць дзяліць дзяцей у групах падоўжанага дня па 15 выхаванцаў у групе, таму колькасць вучняў у групе дасягае 30 чалавек. А выхавальніку, між іншым, трэба іх накарміць, пакласці спаць, дапамагчы кожнаму выканаць хатняе заданне, вывесці дзяцей на прагулку. У той жа час у нашым пасёлку функцыянуе дзіцячы садок-яслі з прыгожай назвай «Каласок» — там у групах усяго па 10 дзяцей, і на аднаго работніка прыпадаюць два выхаванцы. Дазвол на гэта далі раённыя эканамісты на той падставе, што гэта самы вялікі вясковы дзіцячы сад (на 50 чалавек). Значыць, сад — вясковы, а школа — гарадская?

Хачу дадаць, што некаторыя вёскі (такія, як Нягневічы, Кашалёва, Вераб'евічы і іншыя) па сваёй інфраструктуры не толькі не саступаюць, а нават перасягаюць наш гарпасёлак. Дык чаму мы вымушаны карыстацца ўсімі «прывілеямі» гаражан?

З павагай, Грынюк Л.М.,
г.п. Любча, Навагрудскі раён.

У ВОЙСКА З КВЕТКАВАЙ ВУЛІЦЫ

У Клімавічах адкрылі новы будынак раённага ваеннага камісарыята.

Двухпавярховы будынак на вуліцы Кветкавай раённага цэнтра ўзведзены ўсяго за паўтара года: у ім створаны добрыя ўмовы для працы работнікаў ваенкамата і камісіі па прызыве ва Узброеныя Сілы. Раней райваенкамат месціўся ў вельмі старым аварыйным будынку. Грошы на новае будаўніцтва выдаткаваў бюджэт Магілёўскай вобласці, праект ажыццявілі клімавіцкія будаўнікі.

Ілона ІВАНОВА.

КАБ НЕ ЗБЕГЛА МАЛАКО

Лебедзеўскі сельскі Савет перадаў закупку насельніцкага малака ў «прыватныя рукі». Незадаволеных няма.

Вадзім КАЧЭРГА працуе без выхадных. Яму дапамагае сын Ягор.

З надвор'ем не пашанцавала... Як толькі мы ад'ехалі ў кірунку Маладзечна, каб сустрэцца з першым і на той момант адзіным у раёне (і вобласці!) індывідуальным прадпрымальнікам, які займаецца зборам малака з прыватных падворкаў, неба нібыта прарвала...

Дзякуй старшыні Лебедзеўскага сельскага Савета Леаніду Семашкевічу — сустрэў на машыне ледзь ці не ля самой чыгункі. «Калі паспяшаемся, — сказаў Леанід Іванавіч, — яшчэ заспеем Вадзіма за працай. Ён якраз заканчвае збіраць малако ў Мароськах».

Старшыня Лебедзеўскага сельскага Савета Леанід СЕМАШКЕВІЧ.

На гадзінніку 10.20. Цікаўлюся, у колькі пачынаецца ў малаказборшчыка працоўны дзень. «У 5 гадзін раніцы, — адказвае Семашкевіч. — Да 12 гадзін ён ужо адвозіць сабраную прадукцыю на перапрацоўчы камбінат у Маладзечна і ў другой палове дня, лічыце, свабодны».

Пакуль едзем у вёску Мароські, што на тэрыторыі Лебедзеўскага сельсавета, Леанід Іванавіч расказвае «перадгісторыю» пытання. Некалькі гадоў запар малако з сельсавецкіх падворкаў збіралі шэсць малаказборшчыкаў: чацвярых арганізаваў СВК «Заскавічы», дваіх — аграфірма «Лебедзева». Вёскі яны аб'язджалі на конях, малако збіралі ў бітоны (кожны — у свае), а потым зліваліі іх у агульную цыстэрну малакавоза.

— І, ведаеце, былі праблемы... Здасць, скажам, вясковец малако высокай тлустасці. А ў лабараторыі праверацъ — тлустасць усяго 3,1 ці 3,2 працэнта выходзіць... Або напішуць малаказборшчыкі, што сабралі 600 літраў, прывязуць на завод, а там высвятляецца: не 600, а толькі 550... А то выхадны дзень сабе нехта з іх раптам наладзіць — у нядзелю ці на святы. А ў людзей малако закісае... Непарадак.

— А Вадзім штодзень працуе?

— Штодзень... Без выхадных, без святаў. У палове на шостую ён ужо на першым падворку. За некалькі гадзін аб'язджае 15 вёсак — усе, дзе жывуць малаказдатчыкі. Па 140 кіламетраў кожны дзень накручвае.

Так выглядае цэнтр вёскі Лебедзева.

Сама ідэя — перадаць закупку насельніцкага малака «ў рукі» прыватнаму прадпрымальніку — прывезеная з Глыбоцкага раёна, прызнаецца Леанід Іванавіч, не жадаючы прысвойваць сабе лаўры глыбоцкіх калег. Там малако ў насельніцтва збіраюць не СВК, не сельскі Савет, а выключна прадпрымальнікі.

— Мы, калі пра гэта даведаліся, зазбіраліся ў Глыбокае. Паехалі цэлай дэлегацыяй — старшыня раённага Савета дэпутатаў Луцыя Віктараўна Арловіч, дырэктар малочнага камбіната, інспектар па закупках, старшыня Палачанскага сельскага Савета і я... Пахадзілі, паглядзелі, «памацалі» сваімі рукамі, пагаварылі з людзьмі — там і сапраўды ўсё на высокі ўзровень пастаўлена... Вярнуўся я, сеў і пачаў лічыць. Па ўсім выходзіла, што адзін індывідуальны прадпрымальнік пры наяўнасці адпаведнай тэхнікі і абсталявання можа спакойна замяніць нашых шасцярых малаказборшчыкаў з іх коньмі і падводамі. І мы пачалі такога чалавека шукаць.

Першыя спробы не ўвянчаліся поспехам. Ахвотныя збіраць малако ў насельніцтва знайшліся хутка — але кожны з іх выставіў свае ўмовы, якія ішлі «ўразрэз» і з пажаданнямі вяскоўцаў, і з графікам работы камбіната. А потым з'явіўся Вадзім Качэрга — 30-гадовы гараджанін, жыхар Маладзечна.

— Я яго з умовамі пазнаёміў, на малочны камбінат разам з'ездзілі. Ён сказаў: «Усё зразумела, буду стараццa». З транспартам і абсталяваннем пытанне таксама вырашылася — Вадзім жа раней грузаперавозкамі займаўся, дык мы на яго грузавічок спісаную металічную бочку прымацавалі... Спачатку далі яму тэрыторыю аграфірмы «Лебедзева» — там усяго шэсць вёсак малако здаюць. Думаем, няхай спярша павучыцца, папрабуе... Дзесяць дзён прайшло — ён просіць большы аб'ём работы! Ну і аддалі ўсе вёскі. І выдатна, і пытанняў няма, і людзі задаволеныя... Ён і пробы малака на аналіз бярэ, і грошы, якія прадпрыемства пералічвае за здадзенае малако, сам у банку атрымлівае і прывозіць людзям дадому, пад роспіс — акуратна, дзень у дзень, капеечка ў капеечку.

...Пад'язджаем да Маросек і адразу заўважаем машыну Вадзіма Качэргі — іншых на вуліцы і няма. Гаспадыня дома выносіць на двор вядро з малаком, Вадзім акуратна падхоплівае яго, пералівае ў маленькую бочачку, што стаіць у кузаве... Уся «аперацыя» займае лічаныя хвіліны.

— А як малако адсюль у вялікую бочку «перакачоўвае»? — цікаўлюся ў Вадзіма.

— Усё вельмі проста. Па дарозе ў іншую вёску я ўключаю тумблер, і з маленькай бочкі ў вялікую яно перапампоўваецца само. Вельмі зручна, не трэба ўвесь час лазіць з бітонам малака ўверх—уніз, як гэта робяць малаказборшчыкі... Мы гэту сістэму ў Глыбокім перанялі, яна нескладаная, збояў пакуль не было, — цярпліва тлумачыць Вадзім.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

СТАРЭЙШЫНА ПРАЦУЕ НЕ ЗА ГРОШЫ

Іх называюць па-рознаму, у залежнасці ад месцазнаходжання населенага пункта: старасты, старэйшыны, памочнікі старшыні сельскага Савета, адказныя за вёску... Але сутнасць ад перамены назвы не змяняецца. На сёння старасты — гэта найбольш эфектыўная (і найбольш распаўсюджаная) форма тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання ў сельскай мясцовасці. Многія старшыні сельскіх Саветаў, з якімі даводзілася закранаць гэтую тэму, так і кажуць: працоўны дзень у нас пачынаецца менавіта з «абзвону» нашых памочнікаў. Што сёння могуць старасты? Наколькі далёка заходзіць іх ініцыятыва і дзе заканчваюцца паўнамоцтвы? Якая іх роля ў жыцці вёскі і на якія бакі гэтага жыцця могуць яны паўплываць? Такая тэма нашага чарговага «адкрытага форуму».

Таісія ІВАНАШКА, старшыня Паўлаўскага сельскага Савета дэпутатаў Слонімскага раёна:

— У нас пятнаццаць населеных пунктаў, і ў кожным ёсць свая «мясцовая» ўлада — 14 старастаў і адзін сельскі камітэт. Вось яны і «звязваюць» насельніцтва з сельвыканкамам. А акрамя гэтага, дапамагаюць нам добраўпарадкаваць грамадзянскія могілкі (якіх на тэрыторыі сельсавета 11), сочаць за работай вулічнага асвятлення, удзельнічаюць у абходах камісіі па супрацьпажарнай бяспецы. Прыцягваем іх і да тлумачальных гутарак з насельніцтва, скажам, з тымі вяскоўцамі, якія кароў трымаюць — каб яны больш малака дзяржаве здавалі.

Ёсць такія актыўныя старасты, якія не толькі ставяць пытанні перад больш высокімі ўладнымі структурамі, але і самі дапамагаюць іх вырашаць. Напрыклад, Ніна Сцяпанаўна Ждановіч з вёскі Шундры актыўна займаецца пошукам гаспадароў нежылых дамоў, дапамагае людзям з вызначэннем спадчыннасці. Дзякуючы яе старанням у вёсцы няма праблем з пустымі будынкамі — усе яны маюць гаспадароў. Летась мы заахвочвалі самых актыўных невялікімі грашовымі прэміямі — па 20 тысяч. Відавочна, што нашы старасты працуюць не за грошы. Проста такая ў іх жыццёвая пазіцыя.

Васіль БАРАНОЎСКІ, старшыня Студзёнкаўскага сельскага Савета дэпутатаў Сенненскага раёна:

— За парадкам у 47 нашых вёсках сочаць 28 старэйшын. Старэйшыны не вырашаюць глабальных праблем. Іх задача — своечасова заўважыць збой у функцыянаванні той ці іншай сістэмы і паведаміць пра гэта мне ці адпаведнай службе.

Скажам, дзесьці лямпачка не гарыць, а можа, і ўвогуле святло прапала, ці наадварот, не спрацавала рэле часу, і лямпачкі свецяць цэлы дзень — старэйшына тэлефануе нам, мы звязваемся з раённымі электрасеткамі, і тыя ўжо ліквідуюць непаладкі.

Выбіраючы старэйшын, мы арыентаваліся ў першую чаргу на тыя населеныя пункты, дзе ёсць тэлефонная сувязь, каб мець аператыўнае інфармаванне. Хуткая сувязь — гэта, лічы, палова справы... У красавіку мы праводзілі са старэйшынамі такую нараду-вучобу — давалі ім інфармацыю пра ўсе службы раёна, тлумачылі, хто і за што адказвае, якія функцыі выконвае тая ці іншая структура. Цяпер старэйшына, калі ўзнікае нейкая праблема, можа звярнуцца непасрэдна ў адпаведную «інстанцыю» — гэта сістэма адрэгулявана і працуе. Скажам, не прыехала своечасова аўтакрама або не прывезлі людзям тавар па заяўках — старэста адразу звязваецца са старшынёй райспажыўсаюза.

Вось хацелі ў нашай вёсцы Леснікова зачыніць краму... А гэта ж не проста крама, а, да ўсяго іншага, адзін на некалькі вёсак «грамадскі пункт», дзе людзі іншы раз маглі проста сабрацца, нешта абмеркаваць. Дык старэйшына вёскі Таццяна Іванаўна Шаматульская ўзняла гэту праблему, сабрала подпісы (больш за 100 чалавек падпісалася супраць закрыцця крамы) і з гэтым лістом звярнулася ў сельскі Савет. А ўжо мы ў сваю чаргу — у райвыканкам... Праблема вырашалася месяцы два, да таго часу з крамы ўжо вывезлі ўсё абсталяванне. Але Таццяна Іванаўна не здавалася, стаяла на сваім: крама патрэбна, ёй карысталася не менш за 160 чалавек! І райспажыўсаюз адступіўся — гандлёвы пункт давялося пакінуць. І абсталяванне назад завезлі, і прадаўца знайшлі... А калі б не Таццяна Іванаўна, хадзіла б цяпер у Леснікова аўтакрама, што, зразумела, звузіла б пакупніцкія магчымасці насельніцтва.

Ніне Нікіфараўне Рукаль, старэйшыне вёскі Цыганкі, можна спакойна даверыць збор падаткаў на зямлю і на нерухомасць (што мы і робім), а таксама збор у небюджэтны фонд — добраахвотныя грашовыя ахвяраванні, якія ідуць на навядзенне парадку ў населеных пунктах, рамонт грамадскіх калодзежаў.

Старэйшыны былі ў нас і раней, але іх праца ніяк не заахвочвалася, а значыць, і патрэбаваць з іх нельга было. Але два гады таму Віцебскі аблвыканкам прыняў рашэнне аб заахвочванні старэйшын. Цяпер адзін раз у квартал мы выплачваем лепшым з іх па 1-2 базавыя велічыні. Усяго на гэтыя мэты нам выдзелена 2,5 мільёна рублёў на год. У людзей з'явіўся стымул, і нам стала лягчэй працаваць — іншы раз і патрэбаваць з кагосьці можна.

Дарэчы, мы тут перагледзелі ранейшае стаўленне да самога паняцця «старэйшына». Раней жа мелася на ўвазе, што калі ты старэйшына, значыць, ужо стары ці пажылы чалавек. Цяпер адыходзім ад гэтага, даём «дарогу» больш маладым, не абавязкова пенсійнага ўзросту. І вынік адчуўся адразу. Усе праблемныя пытанні цяпер вырашаюцца больш хутка і эфектыўна. Так што не трэба баяцца «амаладжэння»!

Ангеліна ПАРФЁНЦАВА, старшыня Бабовіцкага сельскага Савета дэпутатаў Гомельскага раёна:

— Адлегласць ад цэнтра нашага сельсавета да самага аддаленага населенага пункта складае 32 кіламетры — бо да Бабовіцкага сельсавета былі далучаны апошнімі гадамі яшчэ два. Самі разумееце, не кожны дзень у тую вёску даедзеш, ды і вяскоўцам да сельвыканкама дабірацца няпроста... Так што старасты — а ў нас яны завуцца памочнікамі старшыні сельскага Савета — людзі незаменныя. Пакольк яны ёсць у кожным населеным пункце, то я як старшыня Савета дэпутатаў заўсёды ў курсе тамтэйшых спраў. У нас тут не так даўно бураны прайшлі, дык мае памочнікі мяне адразу праінфармавалі: дзе, у якіх вёсках адключылася святло.

А ўвогуле яны і абходы пажылых людзей дапамагаюць рабіць, і пытанні супрацьпажарнай бяспекі мы разам з імі вырашаем, і збор падаткаў і добраахвотных ахвяраванняў ім давяраем. Вясной і восенню менавіта на іх кладзецца арганізацыйная работа па добраўпарадкаванні могілак.

Не думайце, што нашы памочнікі — звычайныя «статысты» ці інфарматары. Сярод іх шмат неабыякавых, ініцыятыўных людзей (уласна кажучы, па гэтых крытэрыях і выбіралі).

Прывяду прыклад. У вёсцы Цыкуны быў раней ФАП. Потым яго закрылі, бо колькасць жыхароў у гэтым населеным пункце менш за 200. Але памочніка старшыні сельскага Савета па гэтай вёсцы Жанету Арташэсаўну Ухцінскую такое становішча рэчаў не задаволіла. Яна пахадзіла па інстанцыях, звярнулася ў органы аховы здароўя... Сабралі мы грошы, арганізавалі людзей, зрабілі касметычны рамонт гэтага будынка і адкрылі там дом сацыяльных паслуг.

Дзякуючы намаганням Жанеты Арташэсаўны, цяпер сюды з гарадской паліклінікі некалькі разоў на месяц прыязджае ўрач і праводзіць прыём: і ціск людзям памерае, і лекі патрэбныя выпіша.

На мой погляд, калі адказнасць за вырашэнне мясцовых праблем канкрэтнага населенага пункта ўскладзена на аднаго чалавека, карысць ад гэтага відавочная. І ён да сваіх абавязкаў ставіцца сур'ёзна, і людзі ведаюць, да каго ў першую чаргу звярнуцца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ДЭКРЭТ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Сацыяльнае сіроцтва — злабадзённая праблема грамадства. На чарговай сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутаты абмеркавалі рэалізацыю Дэкрэта № 18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у нядбайных сем'ях».

З трыбуны прагучала: дзякуючы гэтаму дакументу ўдалося збіць хвалю безадказнага стаўлення бацькоў да сваіх дзяцей. Скарачаецца колькасць дзяцей, якія страчваюць сувязь з біялагічнымі сем'ямі. Калі ў 2007 годзе іх было 642, то ў першым паўгоддзі 2009-га — 231. Цяпер у праблемных сем'ях Магілёўскай вобласці жывуць 2,5 тысячы дзяцей, да дэкрэта іх было нашмат больш. Нават за першае сёлетняе паўгоддзе колькасць дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, скарацілася на некалькі соцень.

Дэкрэт № 18 **намеснік пракурора Магілёўскай вобласці Франц ВАЙЦЯХОВІЧ** назваў актам справядлівасці.

— Мы маем дзяцей і выдаткоўваем грошы на іх утрыманне і выхаванне, — сказаў ён. — Людзі кідаюць дзяцей, а мы, законапаслухмяныя грамадзяне, праз свае падаткі павінны ўтрымліваць чужых дзяцей. Гэта нядобра. Цяпер, паводле Дэкрэта, мы можам прымусіць працаваць лайдакоў і п'яніц. Гэта складаная задача, але магчымая.

— Дэкрэт — эфектыўны рычаг уздзеяння на нядбайных бацькоў, — лічыць **старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў Леанід БАРКОЎСКІ**. — Мінуў той час, калі людзі лёгка і проста пісалі заявы на пазбаўленне бацькоўскіх правоў. П'яніцы і дармаеды цяпер узважваюць, ці варта перакладаць клопат пра дзяцей на плечы дзяржавы, бо потым давядзецца за гэта расплаціцца.

Галоўная задача грамадства — не толькі запатрабаваць у нядбайных бацькоў грошы на ўтрыманне кінутых імі дзяцей, а спыніць сацыяльнае сіроцтва. Але менавіта кампенсаванне дзяржаўных стратаў улады лічаць асноўным паказчыкам выканання Дэкрэта № 18.

З года у год узровень кампенсавання павялічваецца. У 2007-м ён складаў толькі 21 працэнт, а ў першым сёлетнім паўгоддзі перавысіў 45 працэнтаў. У Магілёўскай вобласці цяпер атрымалі працу 99 працэнтаў абавязаных асобаў. Многія з іх, праўда, кампенсуюць выдаткі на дзяцей не ў поўным аб'ёме. Людзі, якіх у абавязковым парадку ўладкоўваюць на працу, звычайна не маюць ніякай кваліфікацыі. На сельскагаспадарчых прадпрыемствах яны атрымліваюць у сярэднім ад 200 да 400 тысяч рублёў штомесяц. Між тым, утрыманне дзяцей у дзяржаўных установах апошнім часам падаражэла на трэць.

Кіраўнікі арганізацый прымаюць на працу абавязаных асобаў, але робяць гэта неахвотна. Такія людзі п'юць, парушаюць дысцыпліну і прагульваюць. Колькасць прагулаў — гэта часам проста неверагодныя лічбы. Напрыклад, толькі за сёлетні ліпень у вобласці зафіксавана больш за 7 тысяч выпадкаў, калі абавязаныя асобы не выйшлі на працу без аніякіх прычын. Нездарма на прадпрыемствах гавораць, што ім лягчэй проста плаціць за абавязаных, чым глядзець, як яны блытаюцца пад нагамі і перашкаджаюць працаваць усім.

Аднак замест звальнення іх усё ж давядзецца выхоўваць. Працоўны калектыў павінен браць удзел у гэтай важнай справе. На сесіі казалі, што трэба прызначаць абавязаным грамадскіх выхавальнікаў, і гэтую дадатковую нагрузку (шчыра скажам — вельмі нялёгкую) адзначаць матэрыяльна.

— Заканадаўча ўсё вырашана, цяпер патрэбна карпатлівая праца з кожным чалавекам, — настойваў **памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь ЛАЎРАНКОЎ**.

У выніку абмеркавання дэпутаты прыйшлі да адзінай высновы: нядбайных бацькоў, алкаголікаў і лайдакоў трэба выхоўваць усімі сіламі. Разам з жорсткім прымусам да адпрацоўкі грошай, якія выдаткаваны на іх дзяцей, патрэбна прафілактыка.

Дэпутаты ўносяць свой уклад у агульную працу з праблемнымі бацькамі. Такі досвед ёсць у некаторых Саветах: у Кастрычніцкім раёне Магілёва дэпутаты розных узроўняў бяруць пад апеку сем'і, дапамагаюць ім вырашаць праблемы і сочаць за выццём дзяцей. Аднак з трыбуны сесіі прагучала: дэпутацкай ініцыятывы па прафілактыцы сацыяльнага сіроцтва пакуль мала.

Актыўна працуюць з нядбайнымі бацькамі ў Глушанскім сельсавеце Бабруйскага раёна. Менавіта ў гэтым вясковым раёне міліцыя, улады і грамадскасць выкарыстоўваюць усе метады: напрыклад, там ёсць «Вокны ганьбы», дзе можна пабачыць тварыны нелегальных гандляроў спіртнымі напоямі. П'янства бацькоў з'яўляецца асноўнай прычынай сацыяльнага сіроцтва дзяцей. На ўліку ў рэгіёне стаяць каля 9 тысяч алкаголікаў, якія маюць непаўналетніх дзяцей. Малыя, калі яны вымушаны жыць у абстаноўцы п'янства, капіруюць жыццё бацькоў: каля 2 тысяч непаўналетніх маюць сур'ёзныя праблемы з алкаголем, і часта менавіта яны ўчыняюць правапарушэнні.

Хаця намаганні па выкананні Дэкрэта № 18 дазволілі паменшыць і падлеткавую злачыннасць: сёлета ў параўнанні з першым леташнім паўгоддзем яна скарацілася амаль утрая. У Магілёўскай вобласці ўпэўненыя, што забіранне дзяцей з атмасферы хамства і п'янай лаянкі дазволіла стабілізаваць сітуацыю ў моладзевым асяроддзі. Праўда, апошнімі гадамі ўзрост нядбайных бацькоў становіцца ўсё меншым: цяпер асноўнай масе тых, хто кідае сваіх дзяцей, не нашмат больш за 30 гадоў.

— Падаецца, што апошняе дзесяцігоддзе мінулага стагоддзя дае нам гэты негатыў, — лічыць **старшыня абласнога Савета па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, дэпутат Уладзімір МАРТЫНОЎСКІ**. — Пра доўг, гонар і сям'ю тады сталі забывацца. Грамадству патрэбна маральнае, духоўнае выхаванне.

Да гэтай праблемы падключаецца і царква. Ёсць добрыя прыклады: у вёсцы Туркі Варапаеўскага сельсавета Бабруйскага раёна мясцовы святар і ўся праваслаўная абшчына ўзялі на сябе клопат пра праблемныя сем'і, аж да праверак агарода — што пасеялі і сабралі, ці ёсць у хаце ежа для дзяцей.

— Трэба дапамагаць дзецям, якія сталі сіротамі пры жывых бацьках, — звярнуўся да дэпутатаў **епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі САФРОНІЙ**. — Страшна такія словы вымаўляць. Гэта трагедыя і хвароба нашага грамадства. Разводы, злачынствы, суіцыды, наркаманія, п'янства стаяць у адным шэрагу.

Цяпер алкаголікаў, якія ўпарта прытрымліваюцца асацыяльнага ладу жыцця, больш актыўна накіроўваюць у ЛПП. Аднак барацьба з зялёным зміем па-ранейшаму застаецца адкрытым пытаннем: спажыванне алкаголю на душу насельніцтва ў рэгіёне павялічылася апошнімі гадамі ў 1,3 раза.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Алег САКАДЫНЕЦ вылучыў цікавую прапанову:

— Трэба стварыць гасразліковы рэабілітацыйны цэнтр для людзей, якія пакутуюць ад наркалагічнай залежнасці. Сем'і алкаголікаў гатовыя плаціць грошы, каб алкаголікі мелі магчымасць лячыцца і працаваць. Пакуль жа наркалагічная дапамога яўна адстае ад патрэбаў: колькасць алкаголікаў, якія стаяць на ўліку, значна ніжэйшая за рэальную.

На сесіі гэта прапанова выклікала дэбаты. Адны лічаць, што эфектыўнасць лячэння ад алкагалізму вельмі малая, таму трэба засяродзіцца на абмежаванні продажу алкагольных напояў і барацьбе з нелегальнымі сурагатамі. Аднак кіраўніцтва вобласці падтрымала слушную прапанову Алега Сакадынца. Праекты, накіраваныя на аздараўленне праблемных сем'яў, атрымаюць падтрымку ўладаў. Напрыклад, дабрачынная хрысціянская арганізацыя «Табея» плануе стварыць камуну па выхаванні нядбайных бацькоў і вяртанні людзей да нармальнага жыцця.

— Галоўная каштоўнасць — гэта дзеці, — нагадаў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК**. — І калі яны трапляюць у небяспечную сітуацыю, трэба не чакаць, а тэрмінова прымаць рашэнні аб іх абароне. Я бачу галоўную задачу вертыкалі і грамадства ў выяўленні праблемных сем'яў на ранняй стадыі, каб не дапусціць выпадкаў знаходжання дзяцей у ненармальных умовах.

Спецыялісты лічаць, што часовае адсяленне дзяцей ад нядбайных бацькоў у сацыяльныя прытулкі дае добры вынік. Калі гэта зроблена на ранняй стадыі і бацькі яшчэ не дайшлі да глыбокай маральнай і алкагольнай дэградацыі, у іх больш шанцаў на выпраўленне і вяртанне да нармальнага ладу жыцця, а у дзяцей — на вяртанне ў біялагічныя сем'і.

За час дзеяння Дэкрэта № 18 (а гэта 2,5 года) у Беларусі вярнуліся ў свае сем'і амаль 1200 дзяцей, а гэта па колькасці больш за дзясятак дзіцячых дамоў.

Ілона ІВАНОВА.

КАБ НЕ ЗБЕГЛА МАЛАКО

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Ён сапраўды гараджанін — нарадзіўся ў Маладзечне. Праўда, бацькі жылі ў прыватным доме і трымалі сваю гаспадарку, але кароў сярод «жыўнасці» не было. Так што ніякіх спраў з імі Вадзім раней не меў. Да пары да часу займаўся грузаперавозкамі, нават трымаў сваю фірму.

— А потым надарыўся крызіс, з грузаперавозкамі стала горш, працы паменела... Вось і рашыўся на змену «іміджу».

Для 14-гадовага Ягора ўстаць разам з татам у 5 гадзін раніцы — не праблема.

Працуе Вадзім на новым месцы амаль месяц. Спачатку, прызнаецца, было страшна — усё новае, нязвыклае... Баяўся, што вядро з малаком у рукі возьме, а яно перавернецца. Хваляваўся, што не ўспрымуць яго, новага чалавека, ды яшчэ гарадскога, вяскоўцы.

— І як прынялі?

— Ды цудоўна прынялі, асабліва сумленныя людзі, якія ваду ў малако не падліваюць, — адказвае Вадзім. — Ну а тыя, каго, як кажуць, за руку схапіў, натуральна, крыўдзяцца. Маўляў, мы малако высокай тлустасці здавалі, а што вы там, у сваёй лабараторыі, намералі — не нашы праблемы.

Як малаказборшчык Вадзім Качэрга мае поўнае права кантраляваць якасць прадукцыі. Раз у дзесяць дзён (а калі трэба, то і часцей) ён бярэ пробы малака на тлустасць з кожнага падворка, пазначае іх адпаведнымі нумарамі і адвозіць у лабараторыю Маладзечанскага малочнага камбіната. У залежнасці ад вызначанай тлустасці кожнаму малаказдатчыку за 10 дзён будуць налічвацца грошы. Калі нехта з іх, па выказванні Вадзіма, «змухляваў», лабараторны аналіз адразу выявіць. І грошы несумленнаму гаспадару налічаць зыходзячы з нізкай тлустасці.

— А без лабараторнага аналізу, так бы мовіць, «няўзброеным вокам» можна вызначыць, у каго малако няякаснае?

— Можна, і я гэта бачу. Але «вока» можа і памыліцца, а вось у лабараторыі ўсё вызначаюць дакладна. Калі ёсць падазрэнні, пробу малака з падворка бяруць паўторна — дзеля гэтага на месца выязджае лабарант прадпрыемства. Так што асабіста да мяне ў людзей — ніякіх прэтэнзій.

Вадзім прачынаецца ў 4 гадзіны, а ў 5.30 заязджае ў першую вёску... Заканчваецца аб'езд да 11 раніцы. Калі гаспадары да гэтага часу ўжо сыходзяць на працу, вядро з малаком яны накрываюць і пакідаюць на двары, на спецыяльным пастаменце, або (калі спякотна) у тазіку з халоднай вадой. Вадзім заходзіць у двор, акуратна пералівае малако ў бочку і вяртае «тару» назад.

— Падабаецца, што людзі вам давяраюць?

— Мяне гэта шчыра радуе... Не ведаю, як будзе далей, але пакуль што новая праца прыносіць толькі задавальненне.

Ён гаворыць гэта проста, не пафасна, не на «ўключаны дыктафон». Вадзім, на мой погляд, — гэта прадстаўнік новай фармацыі і... новай вёскі. Ён не хоча атрымліваць грошы і пры гэтым нічога не рабіць. Ён імкнецца да годнай працы і, адпаведна, прыстойнай зарплаты. Большы аб'ём малака лепшай якасці — гэта і яго грошы таксама. За кожную тону базавай тлустасці (3,6 працэнта) камбінат плаціць малаказборшчыку 120 тысяч рублёў.

— Калі тлустасць будзе меншай, за тую ж самую тону сабранага малака я атрымаю менш грошай... Так што матэрыяльная зацікаўленасць — лепшы стымул у маёй працы. І нада мной не трэба стаяць з бізуном і кантраляваць.

За першыя дзесяць дзён працы Вадзім зарабіў 1 мільён 900 тысяч рублёў. Калі «адмінусаваць» падатак, адлічэнні ў фонд сацыяльнай абароны, выдаткі на паліва і амартызацыю аўтамабіля, застанецца «чысты» мільён. За месяц, адпаведна, набягае тры. Сёння для Вадзіма і яго сям'і гэта асноўная крыніца даходаў.

— Калі так пойдзе і далей, — падводзіць ён рысу пад нашай размовай, — грузаперавозкі мне ўжо не спатрэбяцца.

Безумоўна, ведае Вадзім і пра тое, што патрабаванні да якасці сыравіны на малочных прадпрыемствах сталі сёлета больш жорсткімі. І вяртанне малака цэлым вёскам — з'ява цяпер ужо не рэдкая.

— На маім участку — а я збіраю малако са 130 падворкаў Лебедзеўскага сельсавета — выпадкаў вяртання малака з камбіната не было. Пра тое, што нельга здаваць сапсаваную антыбіётыкам прадукцыю, я нагадваю вяскоўцам пастаянна. Ды і людзі самі себе не ворагі — каму ж хочацца, каб потым усю «партыю» назад вярнулі?

— Ну а калі, не дай Бог, што-небудзь здарыцца, і вы не зможаце прыехаць па малако? — задаю Вадзіму «правакацыйнае» пытанне.

— Як гэта не змагу? — здзіўляецца ён. — На выпадак хваробы мяне можа падмяніць брат, калі ж паломіцца машына, у мяне ёсць яшчэ адна, каб яе буксіраваць, і цэлых паўдня на ремонт.

— У Глыбоцкім раёне, дзе мы пабывалі, такія праблемы вырашаюцца проста, — падключаецца да размовы Леанід Семашкевіч. — Пакольк там закупкай малака ў насельніцтва займаецца 15 індывідуальных прадпрымальнікаў, у іх практыкуецца і ўзаемавыручка, і ўзаемазамяняльнасць. У нас такі прадпрымальнік пакуль што адзін — Вадзім Качэрга. А трэба, каб было больш, каб і ў іншых сельсаветах — асабліва там, дзе ёсць праблема з калгаснымі малаказборшчыкамі, мясцовая ўлада паварушылася і знайшла прадпрымальных людзей на іх месца.

Пасля таго, як мясцовая прэса расказала пра Вадзіма Качэргу, у кабінеце Семашкевіча не змаўкаюць тэлефонныя званкі — ахвотныя пераквалiфікавацца ў «прыватных малаказборшчыкаў» прапануюць свае паслугі.

— Я іх да сваіх калег накіроўваю, у іншыя сельсаветы. Дарэчы, у Палачанскім сельсавеце ўжо таксама дамовіліся з індывідуальным прадпрымальнікам, які будзе збіраць малако ў насельніцтва. Ды і ў іншых сельсаветах рух пайшоў...

Зразумела, дадае Леанід Семашкевіч, сёння на абы-якія стартавыя ўмовы ні адзін прадпрымальнік не пагодзіцца. Тут і статак прыстойны павінен быць, і аб'ёмы здадзенай прадукцыі. У Лебедзеўскім сельсавеце, напрыклад, людзі здаюць цяпер не менш за тону малака ў дзень, а то і значна больш — 1,5 тоны. Тут ёсць на чым зарабляць «капітал». Ды і сам вонкавы выгляд тэрыторыі, створаныя ўмовы пражывання здольны прыцягнуць чалавека з прадпрымальніцкай «жылкай»: добрыя дарогі, дагледжаныя сядзібы, прыстойныя крамы...

Мясцовыя жыхары сцвярджаюць, што і іншыя сельсаветы Маладзечаншчыны выглядаюць не горш і пры неабходнасці могуць прапанаваць прадпрымальнікам-малаказборшчыкам выгадныя для іх умовы. Так што, магчыма, у хуткім часе глыбоцкае «ноу-хау» ператворыцца ў звыклую сістэму працы для іншых раёнаў і рэгіёнаў краіны.

Як сказаў Леанід Семашкевіч, было б жаданне.

Наталля КАРПЕНКА,
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Маладзечанскі р-н.

НАВОШТА ГЛЫБІНЦЫ «СІЛІКОНАВАЯ ДАЛІНА»?

Статыстыка сведчыць: з года ў год адзначаецца скарачэнне колькасці прысядзібных гаспадарак. У шэрагу вёсак засталіся адны старыя, паколькі моладзь перабралася ў горад ці ў буйныя вёскі (як правіла, цэнтральныя сядзібы сельгаспрадпрыемстваў, што пераўтвораны ў аграгарадкі). Калі не спыніць негатыўныя працэсы, то ўжо ў найбліжэйшы час адбудуцца незваротныя змены. І тады выратаваць вёску ўжо не ўдасца.

Нясвіжскі раён лічыцца адным з перадавых у Беларусі. Высокі ўзровень развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці, большыя магчымасці для сацыяльнай сферы... Але гэта зусім не гарантыя таго, што ўсе праблемы вырашаюцца «аўтаматычна». Узяць, напрыклад, Лявонавіцкі сельсавет. На яго тэрыторыі размешчана 12 вёсак, дзе, паводле апошняй інфармацыі, пражывае 1226 чалавек. Больш чым трэцяя частка насельніцтва — пенсіянеры. Працаздольных 570 чалавек і 208 дзяцей. Тыповы дэмаграфічны «расклад», які характэрны для многіх тэрыторый. Аднак сацыяльная інфраструктура даволі моцная.

— Тут працуюць два комплексы «дзіцячы сад — сярэдняя школа», Дом культуры, два клубы, урачэбная амбулаторыя, фельчарска-акушэрскі пункт, сем крамаў (адна з іх прыватная), комплексна-прыёмны пункт, лазнева-пральны камбінат, два аддзяленні сувязі, аддзяленне банка, лазня, — пералічвае старшыня Лявонавіцкага сельскага Савета Сяргей Шчарбач. — Так што большасць надзённых пытанняў можна вырашыць на месцы, не трэба выязджаць у райцэнтр.

Летась вёска Салтанаўшчына набыла статус аграгарадка і атрымала сапраўдны шанц на будучыню. Засталося толькі яго належным чынам рэалізаваць. Вось тут і ўзнікаюць пэўныя цяжкасці.

У Лявонавіцкай і Салтанаўшчынскай адукацыйных установах займаюцца адпаведна 83 і 74 навучэнцы. З іх 13-15 выхаванцаў дзіцячага садка. У сярэднім на аднаго настаўніка прыпадае... 3-4 вучні.

— Веды тут можна атрымаць вельмі добрыя, — упэўнены Сяргей Шчарбач. — Выпускнікі з'язджаюць «паступаць» у горад, а ў родныя мясціны вяртаюцца літаральна адзінкі.

Большасць мясцовых жыхароў у працаздольным узросце з'яўляюцца работнікамі тутэйшага сельгаспрадпрыемства — ЗАТ «1 Мая». Акрамя аграпрамысловай вытворчасці практычна няма месцаў, дзе можна ўладкавацца. Хіба што ў сацыяльнай сферы ці ў сістэме райспажыўтаварыства.

— Чаму моладзь імкнецца збегчы з вёскі? — пытаецца Сяргей Шчарбач і тут жа адказвае. — Таму што не знаходзіць у глыбінцы магчымасці для рэалізацыі. Далёка не ва ўсіх душа горнецца да сельгасвытворчасці, а альтэрнатыўнай занятасці, пра якую ўсе гавораць не адзін год, так па вялікім рахунку і не створана. Нават тыя, хто застаецца ў гаспадарцы, не ўпэўненыя ў заўтрашнім дні. Тэхналогія развіваецца такім чынам, што з кожным днём змяншаецца патрэба ў працоўнай сіле. На мой погляд, неабходна змяняць падыходы да вырашэння гэтай праблемы. Калі ў Мінску робяць «сіліконавую даліну», то нешта падобнае трэба ствараць і ў глыбінцы. Неабходна запускаць навукаёмістыя вытворчасці, каб людзям было цікава працаваць. Гэта будзе рухавіком пазітыўных пераўтварэнняў.

На тэрыторыі Лявонавіцкага сельсавета 565 прысядзібных гаспадарак. Летась іх колькасць змянілася нязначна, затое ў перспектыве прагназуецца няўхільнае змяншэнне. Адпаведна «мінусуе» і пагалоўе свойскай жывёлы. Напрыклад, летась у параўнанні з 2007 годам статак кароў зменшыўся больш чым напалову (з 99 да 48). Менш сталі трымаць свіней, птушкі, авечак... Тлумачыцца ўсё проста — насельніцтва старэе. Людзям у гадах ужо не па сілах трымаць вялікую гаспадарку, а маладыя проста не жадаюць ёю займацца. Усе прадукты прасцей набыць у краме.

— Такое стаўленне можна зразумець, — заўважае Сяргей Шчарбач. — Карова — гэта лад жыцця. Раней, калі былі вялікія сем'і, жылі разам некалькі пакаленняў, то і трымаць жывёлу было лягчэй. А цяпер не кожны імкнецца да вялікай гаспадаркі, паколькі тут трэба адпрацаваўшы на асноўным месцы працы, яшчэ і ў «другую змену» завіхацца. У асноўным кароў трымаюць людзі ва ўзросце 40-50 гадоў. Асобныя робяць так па звычцы — не могуць на падворку без жывёлы. Ёсць 20—30 сем'яў, якія мэтанакіравана развіваюць прысядзібную гаспадарку, каб мець дадатковы даход. І ў іх гэта атрымліваецца.

Жыхары, якія зацікаўленыя атрымліваць прыбытак з уласнага падворка, рэгулярна здаюць малако дзяржаве. Збірае яго сельскі Савет. А пасля малако здаюць у Нясвіжскі філіял Клецкага малаказавода. Грошы за здадзеную прадукцыю вяскоўцы атрымліваюць своечасова. І «набягае» нядрэнна: як паведаміў Сяргей Шчарбач, з усімі надбаўкамі выходзіць каля 1 тысячы рублёў за літр. Калі мець на ўвазе тое, што моцныя гаспадары здаюць па 15—20 л у дзень і больш, то няцяжка падлічыць, колькі людзі атрымліваюць за месяц. Практычна другі заробак. Зразумела, даецца гэты рубель нялёгка.

Спецыялісты заўважаюць, што апошнім часам у структуры даходаў насельніцтва ўзраслі паступленні ад продажу прадукцыі з уласных падворкаў. Што можна прасачыць і ў Лявонавіцкім сельсавеце. Калі агульны аб'ём малака, якое было закуплена ў жыхароў, зменшыўся, то ў разліку ад адной каровы, наадварот, узрос. Гэта значыць толькі адно — людзі імкнуцца да таго, каб рэалізоўваць больш лішкаў прадукцыі і такім чынам паляпшаць свой дабрабыт. Аднак сітуацыя далёкая ад аптымістычнай: на 12 вёсак прыпадае 34 каровы і 20 коней.

У карыстанні насельніцтва знаходзяцца 424 гектары зямлі. Для іх апрацоўкі выдзяляецца тэхніка. Пэўная колькасць участкаў вяскоўцаў знаходзіцца ў палях севазвароту. Усе работы тут выконвае сельгаспрадпрыемства, і расцэнкі на іх значна ніжэйшыя за сабекошт. Гаспадарка рэалізуе вяскоўцам парасят, насенне, угнаенні, ім прафесійна дапамагаюць заатэхнічная і ветэрынарная служба. Выдзяляюць людзям сена і збожжа, а салому можна браць бясплатна. Усё гэта, здавалася б, павінна спрыяць развіццю прыватных падворкаў. Аднак змяніць сітуацыю да лепшага не так проста.

— Вялікую ўвагу неабходна надаваць добраўпарадкаванню населеных пунктаў, узвядзенню камфартабельнага жылля, а таксама пабудоў, неабходных для вядзення ўласнай гаспадаркі, — упэўнены Сяргей Шчарбач. — Варта забяспечыць тых, у каго ёсць жаданне ёю займацца, усім патрэбным — ад насення і племяннога маладняку да дапамогі ў пасадцы, доглядзе і ўборцы, а таксама рэалізацыі прадукцыі. Для гэтага павінна быць створана спецыялізаваная арганізацыя, якая б выконвала не толькі згаданыя работы, а і паслугі па рамонце жылля, калодзежаў і г.д. Калі людзі ўбачаць, што ў гэтай сферы наладжаны цывілізаваны сэрвіс, то не будуць апасацца развіваць прысядзібную гаспадарку. Магчыма, такім чынам удасца і моладзь зацікавіць у разгортванні сваіх падворкаў.

Мікалай ЛІТВІНАЎ,
Нясвіжскі раён.

РЫЗЫКОЎНЫЯ ПРАФЕСІІ

У Беларусі найбольш падпадаюць пад рызыку смяротнага траўмавання вадзіцелі аўтамабіляў, трактарысты-машыністы сельскагаспадарчых машын, цесляры, жывёлаводы, падсобныя рабочыя, слесары-рамонтнікі, вартаўнікі, электраманцёры па абслугоўванні і рамонце электраабсталявання, электрагазазваршчыкі. Аб гэтым паведамілі спецыялісты Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы.

Сумная статыстыка першага паўгоддзя гэтага года сведчыць аб гібелі на вытворчасці 16 вадзіцеляў аўтамабіляў, 9 цесляроў, 8 трактарыстаў-машыністаў сельгасмашын, 7 жывёлаводаў, 4 электраманцёраў па абслугоўванні і рамонце электраабсталявання, 3 слесараў-рамонтнікаў, 3 вартаўнікоў і 3 электрагазазваршчыкаў.

БЕЛТА.

СТАРЭЙШЫНА ПРАЦУЕ НЕ ЗА ГРОШЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Наконт матэрыяльнага заахвочання... Яно ў нас прадугледжана ўжо другі год запар. Але летась, напрыклад, на сесіі Савета дэпутатаў мы вырашылі нікога з нашых памочнікаў асабіста не заахвочваць, таму што ўсе працавалі аднолькава. Прынамсі, і самі памочнікі з гэтым пагадзіліся. А грошы — з агульнай згоды — мы патрацілі на добраўпарадкаванне могілак загінулых воінаў... На заахвочванне закладваецца дастаткова сціплая сума — 150 тысяч на год, а памочнікаў у нас 7. Гэтыя грошы мы, безумоўна, можам і некаму аднаму даць, калі ён лепш за іншых спрацуе.

Не думайце, што быць памочнікам старшыні Савета лёгка. Нават каб арганізаваць людзей і знесці старую агароджу на вуліцы, патрэбны пэўныя здольнасці, ініцыятыўнасць і адказнасць. Мой памочнік па вёсцы Старыя Дзятлавічы справіўся з гэтым выдатна. Нам засталося толькі новую агароджу паставіць.

Алена КАПУЗА, старшыня Радастаўскага сельскага Савета дэпутатаў Драгічынскага раёна:

— Кожны месяц у нас праходзяць пасяджэнні сельвыканкама — там абавязкова прысутнічаюць старасты. Яны і ўзнімаюць пытанні, якія на гэты момант хвалююць насельніцтва... Вось нядаўна ў нас затапіла вёску Ражное — прарвала дамбу. Староста адразу акрэсліла праблему: насельніцтву няма куды выганяць скаціну. Акрамя таго, у многіх падтапіла «соткі» з бульбай... Мы прынялі рашэнне — выслабаніць гэтых людзей ад паловы зямельнага падатку за пашу, а старшыні СВК пасля ўборкі ўраджаю перазалужыць пад выпас свойскай жывёлы новыя тэрыторыі... Спісы ўсіх пацярпелых таксама складалі з дапамогай старастаў. Вёсак жа шмат, кожнага чалавека асабіста не праверыш — моцна ён пацярпеў ці не вельмі. Менавіта старасты разбіраліся з гэтым пытаннем і ўносілі яснасць.

Ёсць у нас такая маленькая вёсачка Залессе — жывуць там у асноўным пенсіянеры. Староста вёскі Васіль Іванавіч Церашчук пастаянна клапоціцца пра афармленне для іх адраснай дапамогі. Збірае ў людзей пашпарты і заявы, арганізавана прывозіць іх у сельскі Савет. Ну а мы ўжо займаемся неабходным афармленнем папер... Хачу, дарэчы, адзначыць, што работа старасты ў маленькіх вёсачках асабліва заўважная. Васіль Іванавіч і па лекі людзям ездзіць, і па хлеб ходзіць, і работу аўтакрамы кантралюе... А калі ў нейкай сітуацыі дапамагчы не можа — паведамляе нам.

Нашы старасты заключаюць дагаворы з насельніцтвам на вываз смецця, яны ж абыходзяць з пагаспадарчымі кнігамі падворкі — збіраюць асноўныя зводкі па ўраджайнасці, колькасці жывёлы і г.д., і мы гэту інфармацыю ўжо не перапраўляем. Удзельнічаюць старасты і ў рабоце кантрольна-санітарнай брыгады, якая сочыць за парадкам на прысядзібных участках... Ці можа староста нешта змяніць у жыцці вёскі? Сам, магчыма, і не можа. Але ён павінен звярнуць увагу на праблему, падняць яе і своечасова праінфармаваць органы ўлады. За тры месяцы маёй работы на гэтай пасадзе ні адзін староста не адмовіў мне ў дапамозе.

Наталля КАРПЕНКА.

300 ТЫСЯЧ ЕЎРА

і нават больш атрымае прадпрыемства «Гроднаводаканал» з бюджэту міжнароднага праекта па паляпшэнні экалагічнай бяспекі воднага басейна ракі Нёман.

Гэты праект ажыццяўляецца ў рамках прыгранічнага супрацоўніцтва суседніх рэгіёнаў Беларусі і Літвы. У Гродне будзе заменена тэхналагічнае абсталяванне найбуйнейшай у абласным цэнтры каналізацыйна-помпавай станцыі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,
УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:
НАВІЦКІ Г.В., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні
БАЙКОЎ В.М., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце
АЦЯСАЎ А.Я., старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў
СЦЕПАНЕНКА А.М., адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь
ПРЭДКА С.У., старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці
МАКСІМЕНКА С.А., старшыня Прылепскага сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК:
Наталля КАРПЕНКА.
Кантактны тэлефон 292 21 03.

«ЗВАРОТНЫ» НАПРАМАК

НЯМАСАВАЯ З'ЯВА

Больш шанцаў для працаўладкавання, параўнальна высокія заробкі плюс лепшая інфраструктура – перш-наперш менавіта гэтыя акалічнасці з'яўляюцца прычынай паступовай міграцыі з вёскі ў горад. Але на новым месцы шанцуе не ўсім...

Мінскі гандлёвы каледж, размеркаванне ў Жодзіна, праца ў Барысаве, у рэшце рэшт вяселле і пераезд да мужа Вячаслава ў Мазыр. У нечым «біяграфію» Алены Стукач можна назваць тыповай. Звычайнымі аказаліся і цяжкасці. У Мазыры маладая сям'я была вымушана здымаць дом, да таго ж — без камунальных выгодаў. Тым часам справы ў прыватнай арганізацыі, дзе ўладкаваўся Вячаслаў, сталі ісці ўсё горш. А гэта адбівалася на заробках.

— Тады мы чакалі дзіця, трэба было неяк вызначацца, — узгадвае Алена. — Прычым было зразумела: вялікіх перспектыў у Мазыры няма — нават калі праз шмат гадоў і падышла б чарга на кааператыўную кватэру, было невядома, дзе ўзяць грошы на першы ўзнос. Словам, сітуацыя падавалася амаль безвыходнай, і раптам... убачыла абвестку ў газеце з запрашэннем на працу ў вёску Замкі Крупскага раёна. Пазванілі, муж наведаў гаспадарку з «разведкай», а потым пасядзелі, падумалі і вырашылі — едзем. Бо гаспадарка прапаноўвала някепскую зарплату, і што самае важнае — жыллё.

Сумненні былі. Першым часам у ААТ «Кляновічы» сям'і далі стары дамок, «яшчэ горшы, чым у Мазыры». Але паабяцалі: праз некалькі месяцаў чакайце «сапраўдных» улазінаў. І паказалі будаўнічую пляцоўку. Алена, якая ўжо нарадзіла, не хавае: хадзіла на гэту пляцоўку з каляскай штодня. А ў тое, што ў новым трохпакаёвым доме будуць жыць менавіта яны, паверыла толькі пасля атрымання ключоў. Дату памятае дакладна: 30 сакавіка 2007 года.

— Мы з мужам нарадзіліся ў сельскай мясцовасці, таму вялікіх праблем з адаптацыяй нібыта не было, — заўважае Алена. — Праўда, сцвярджаць, што было лёгка, таксама нельга. Мужу прапанавалі працу, што не стасавалася са спецыяльнасцю, так што давялося на месцы асвойваць новую прафесію. А неўзабаве і яшчэ адну — цяпер ён інжынер па ахове працы і тэхніцы бяспекі. Затое скардзіцца на заробкі не выпадае. Я пакуль знаходжуся ў «дэкрэтным», таму не скажаш, што жывём мы вельмі багата. Але і на дзіцячыя цацкі, і на прысмакі хапае. Хапае і на выплату камерцыйнага крэдыту — за кошт яго набывалі мэблю.

У Замках нарадзілася і другая дачка, цяпер ёй крыху больш за год. Але Алена мяркуе: дзякуючы дзіцячаму садку хутка можна выходзіць на працу. Таксама ў планах будаўніцтва «сваёй» дзіцячай пляцоўкі і гаража. А яшчэ... павелічэнне агарода. Пакуль на вялікія градкі проста не хапае часу.

— Пераязджаць адсюль куды-небудзь зноў? А ведаеце, мы перакананыя: у гэтым няма ніякага сэнсу, — адзначае Вячаслаў. — Нават калі і патрапіць адшукаць у горадзе добрае месца, у лепшым выпадку калі-небудзь удасца назбіраць хіба што на аднапакаёўку, а для сям'і з чатырох чалавек яе ўжо мала. А тут — і добрая праца, і ўласны вялікі дом. Да таго ж я не думаю, што сёння нашы Замкі ў чым-небудзь сур'ёзна «наступаюць» звычайнаму раённаму гарадку. А калі захочацца тых жа вялікіх атракцыёнаў, то праблем няма. Толькі сеў і паехаў — у Крупкі, Барысаў ці ў Мінск.

Вёска Замкі ўжо атрымала статус аграгарадка. Зрэшты, зазначае выканаўца абавязкаў старшыні Бобрскага пассавета Казімір Бучылка, крамы, школа, дзіцячы садок у Замках былі і раней. Адно, што сёння тут вядуцца рамонты і рэканструкцыі гандлёвага цэнтра, Дома культуры, фізкультурна-аздараўленчага комплексу. І на тое — асаблівыя прычыны.

Прычына не толькі ў тым, што з 588 жыхароў аграгарадка маюць пенсійны ўзрост усяго з паўсотні чалавек. Больш важна, што ААТ «Кляновічы» збіраецца пашырыць вытворчасць і запрасіць да сябе новых спецыялістаў. Пакуль вострага «кадравага дэфіцыту» гаспадарка не адчувае. Аднак у яе найбліжэйшых планах будаўніцтва другой чаргі птушкафабрыкі, малочнага цэха, таго ж гандлёвага цэнтра з цэхам па выпечцы хлеба.

— Практыка «пошуку» людзей у іншых населеных пунктах існуе даволі даўно, у нас уладкоўваюцца жыхары Крупак, пераязджаюць нават мінчане, — распавядае намеснік старшыні ААТ «Кляновічы» Святлана Трушына. — Прывабліваюць сюды дзве рэчы — адзін з самых вялікіх у раёне ўзровень зарплаты і жыллё. Пры гэтым у выпадку запрашэння гаспадарка дапамагае з перавозам рэчаў, робіць выплату «пад'ёмных» у памеры акладу непасрэдна на спецыяліста і па чвэрці акладу на кожнага члена яго сям'і. Але ў той жа час варта падкрэсліць: мы прымаем толькі сумленных работнікаў. І сярод прэтэндэнтаў амаль на любую вакансію праходзіць сапраўдны адбор.

Аднак людзі патрабуюцца не толькі тут, і гэта — тэма для асобнай размовы. Запрашэнні сельгаспрадпрыемстваў, «падмацаваныя» жыллём, усё ж не такая рэдкасць. А вось узровень аплаты працы часта «заманлівым» не назавеш. «Стандартныя» прапановы ў вёсцы выглядаюць прыкладна так: 500—600 тысяч рублёў для спецыялістаў і 300—400 — для рабочых.

— Цяпер гаспадаркі раёна маюць каля трох дзясяткаў свабодных месцаў для спецыялістаў, даярак, жывёлаводаў, палявадаў, — кажа намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Крупскага райвыканкама Алена Смірнова. — Пры гэтым рабіць выснову, што вёска сутыкнулася са значным недахопам працоўнай сілы, усё ж нельга: вакансіі перыядычна «закрываюцца» і з'яўляюцца зноў. Аднак такі малюнак сёння. Заўтра ж ён можа змяніцца, бо вядома: вёскі пакрысе «старэюць».

Адзін са шляхоў вырашэння праблемы вядомы даўно — добраахвотнае перасяленне ў сельскую мясцовасць беспрацоўных. Як правіла, з забеспячэннем дамамі ці кватэрамі і абавязкова — з дзяржаўнай падтрымкай. Беспрацоўнаму, які наважваецца змяніць месца жыхарства, робіцца аднаразовая выплата ў 7 бюджэтаў пражытковага мінімуму, а кожнаму члену яго сям'і — у 1 такі бюджэт. Умова ж ставіцца адна — адпрацаваць у новага наймальніка як мінімум год. У адваротным выпадку дзярждапамогу давядзецца вярнуць.

— Наўрад ці трэба чакаць, што перасяленнямі можна вырашыць усе «кадравыя» праблемы ў вёсцы — гэта ніколі не стане масавай з'явай, — заўважае Алена Смірнова. — Аднак таксама зразумела: цікавасць да пераездаў будзе, і асабліва ў моладзі, якая не можа вырашыць свае «жыллёвыя пытанні». Тым больш, што ў маладым узросце пачынаць з «нуля» прасцей.

Сяргей ГРЫБ.
Фота аўтара.
Крупскі раён.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

	Лот № 1
Предмет аукциона	**Капитальное строение инв. № 413/С-5324** (здание аптеки с пристройкой, погребом, холодной пристройкой, уборной, забором, калиткой, воротами и дорожкой), **сарай инв. № 413/С-7927 и право заключения договора аренды земельного участка** для обслуживания недвижимого имущества
Место нахождения объектов	Гродненская область, Свислочский район, дер. Доброволя, ул. Урбановича, 71
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	17 668,742
Сумма задатка, тыс. рублей	1 766,000
Продавец недвижимого имущества (наименование, тел.)	Гродненское торгово-производственное республиканское унитарное предприятие «Фармация», контактные телефоны: (8 0152) 74 43 92, 72 28 30, 74 43 96, 74 06 91
Характеристика объектов недвижимого имущества	**Здание аптеки с двумя пристройками и погребом** – 1968 года постройки, отдельно стоящее, общая площадь 68,2 кв. м, фундамент бутобетонный; наружные и внутренние капитальные стены щитовые, обложены кирпичом, перекрытия деревянные, крыша шиферная, отопление печное, электроосвещение – наружная проводка; газоснабжение – сжиженный газ; имеется радио и телефон; уборная дощатая с бетонным выгребом – 1968 года постройки; забор металлический с воротами и калиткой – 1968 года постройки общей площадью 107 кв. м; дорожка – 1968 года постройки, бетонная, площадь 20 кв. м. **Сарай** – 1968 года постройки, общая площадь 29,2 кв. м, фундамент бутобетонный; стены и перегородки блочные; кровля шиферная
Информация о земельном участке (площадь, срок аренды)	Земельный участок с кадастровым номером 425281301101000067 площадью 0,0508 га, срок договора аренды 50 лет
Условия использования недвижимого имущества	Вовлечение в хозяйственный оборот в течение одного года с момента приобретения
Условия использования земельного участка; ограничения по его использованию	Осуществление в двухмесячный срок после принятия районным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)

1. Аукцион состоится **28 сентября 2009 года** в 11.00 по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона по **23 сентября 2009 года** до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ «Беларусбанк», УНП 500044549;
- юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

4. При подаче документов представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

5. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

6. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

7. Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, если:

- заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;
- ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;
- ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

8. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Претенденту на покупку (участнику аукциона, выразившему согласие на приобретение предмета аукциона) сумма внесенного задатка учитывается при окончательных расчетах за право заключения договора аренды земельного участка и недвижимое имущество по договору купли-продажи.

9. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

10. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

11. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

12. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

13. Оплата стоимости приобретенного предмета аукциона осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа.

14. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

15. В случае невыполнения условий продажи объекта приобретателем имущества, договор купли-продажи расторгается в одностороннем порядке без компенсации затрат.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания продаваемого недвижимого имущества

	Лот № 1
Предмет аукциона (сведения о предмете аукциона, информация о земельном участке: площадь, срок аренды)	**Капитальное строение инв. № 430/С-723** (здание физкультурно-оздоровительного комплекса, проезды и площадки асфальтобетонные площадью 2206,37 кв. м, отстойник ливневой канализации, канализационная сеть фекальная керамическая протяженностью 90,4 п. м, ливневая канализация протяженностью 9,0 п. м, тепловая сеть протяженностью 94,7 п. м, водопроводная сеть хозяйственная питьевая протяженностью 129,0 п. м, линия электропередачи протяженностью 146,2 п. м, канализационная сеть фекальная чугунная протяженностью 19,4 п. м, канализационная сеть (ливневая) трубопровод безнапорный протяженностью 16,5 п. м), **многолетние насаждения в кол-ве 32 шт. и право заключения договора аренды земельного участка** с кадастровым номером 424350100001004439 площадью 0,9252 га сроком на 50 лет
Начальная цена предмета аукциона, тыс. рублей	671 031,122
Сумма задатка, тыс. рублей	67 103,000
Место нахождения объектов	Гродненская обл., г. Новогрудок, ул. Индустриальная, 6
Продавец недвижимого имущества	Дочернее унитарное предприятие «Автобусный парк № 5» республиканского автотранспортного унитарного предприятия «Гроднооблавтотранс», контактные телефоны: (8 015 97) 2 14 02; (8 0152) 77 03 05
Организатор аукциона (наименование, адрес, тел.)	Гродненский областной территориальный Фонд государственного имущества (Фонд «Гроднооблимущество»),230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39, тел. (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней)

1. Аукцион состоится **10 сентября 2009 года** в 11.15 по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к нему документами принимаются Организатором аукциона по **4 сентября 2009 года** до 16.00, кабинет 6.

3. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет Организатора аукциона — Фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 500044549.

4. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Претенденту на покупку (участнику аукциона, выразившему согласие на приобретение предмета аукциона) сумма внесенного задатка учитывается при окончательных расчетах за право заключения договора аренды земельного участка и недвижимое имущество по договору купли-продажи.

5. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

6. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

7. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Подробная информация – в извещении о проведении аукциона, ранее опубликованном в газете «Звязда» от **11 июля 2009 г. № 127 (26485).**

З БОЛЕМ У СЭРЦЫ — ДА ТЭРАПЕЎТА

Прамая лінія

Карысныя падказкі дае загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Ірына ЯКІМОВІЧ

(Працяг. Пачатак у нумарах за 22, 25 жніўня.)

☎ ***— Мінск, Вікторыя. Чытала, што на базе цэнтра бальнеалячэння працуе і цэнтр кітайскай медыцыны. Якія захворванні можна лячыць з дапамогай тамтэйшых спецыялістаў? Як трапіць да іх на кансультацыю?***

— Пры адных захворваннях такая дапамога часцей за ўсё, прымяняецца рэфлексатэрапія можа быць дадатковай да асноўнага курсу лячэння, а пры іншых — асноўнай. Так добра паддаецца лячэнню вегетасасудзістая дыстанія. А для такога захворвання як дэфармуючы астэаартроз, калі ёсць структурныя змяненні храстка, кітайская медыцына можа выкарыстоўвацца як дадатковы метад, паколькі будзе проста змяншаць ацёк, боль.

— А спачатку трэба ісці на прыём да доктара?

— Можна трапіць на прыём да загадчыцы аддзялення традыцыйнай кітайскай медыцыны, а можа накіраваць і любы спецыяліст нашага цэнтра.

— Ці можна адразу прыйсці ў аддзяленне для зняцця болю па прычыне таго ж радыкуліту?

— У час вострага прыступу падобныя маніпуляцыі проціпаказаны. Спачатку трэба атрымаць кансерватыўнае лячэнне ў спецыяліста, а потым дадаць метады ўздзеяння традыцыйнай кітайскай медыцыны.

— Пасля ўжывання пэўнай колькасці часнаку і цыбулі адчуваю не надта прыемныя сімптомы — нібыта боль. Што такое ёсць у гэтай агародніне? Можа, праўда, мне здаецца, і боль мае іншае паходжанне?

— Цыбуля і часнок утрымліваюць вялікую колькасць фітанцыдаў, якія раздражняюць слізістую страўніка. Часта гэта назіраецца ў людзей з хранічным гастрытам, павышанай кіслотнасцю, хранічнай язвавай хваробай страўніка або 12-перснай кішкі. Такім людзям неабходна выключыць з рацыёну падобныя прадукты.

☎ ***— Мінскі раён, Святлана Іванаўна. Пралячыла язву 12-перснай кішкі. Доктар параіла надалей, двойчы ў год, з прафілактычнай мерай ужываць амез. Гэта сапраўды эфектыўны прэпарат?***

— Амез уваходзіць у прафілактыку язвы страўніка і 12-перснай кішкі. Пасля асноўнага лячэння язвавай хваробы рэкамендуецца праводзіць прафілактыку двойчы ў год. 1 таблетка ўвечары, за 30 хвілін да ежы, на працягу 2-3 тыдняў. Плюс адвар насення льну. Аднак тым, хто адчувае непрыемныя болевыя сімптомы, але не абследаваўся, каму не выстаўлены дыягназ, праводзіць такую прафілактыку практычна бессэнсоўна. Справа ў тым, што язва можа быць абумоўлена мікробам хелікабактар пілары. Калі менавіта ён выклікаў захворванне, то амез будзе неэфектыўны. Абвастрэнне надыдзе вельмі хутка. Так што спачатку трэба абследавацца і пралячыцца, як гэта зрабілі вы.

☎ ***— Гродна, Антаніна. Муж прапануе ў кастрычніку паехаць адпачываць у Егіпет. А ў мяне павышаны ціск. Ці не будзе такая паездка небяспечнай для мяне?***

— Калі ў вас падабраныя прэпараты, якія зніжаюць артэрыяльны ціск, а апошні адпавядае аптымальным лічбам — гэта 120/80, то паездка бяспечная. Але падчас яе трэба абавязкова прымаць лекі. Вы павінны забяспечыць сябе імі на ўвесь час адпачынку. І не злоўжывайце знаходжаннем на сонцы.

☎ ***— Лепель, Яўгенія Пятроўна. Тры месяцы таму выдалілі жоўцевы пузыр, але непрыемныя адчуванні засталіся. Што рабіць?***

— Пасля выдалення жоўцевага пузыра неабходна захоўваць дыету, пра якую вам павінен быў расказаць тэрапеўт. Харчавацца трэба часта, не менш як 4—5 разоў на дзень, дробнымі порцыямі. Выключыць з меню вострую, вэнджаную, тлустую ежу. Не ўжываць таматы, кетчуп, чорны хлеб. Аднак, калі пры захаванні дыеты і рэжыму харчавання ў вас застаюцца непрыемныя адчуванні, неабходна звярнуцца да ўрача. Сутнасць у тым, што ў некаторых выпадках бывае такі стан, які называецца постхалецыстычны сіндром. Ён патрабуе медыкаментознай карэкцыі.

☎ ***— Мінск, Наталля Пятроўна. Ці могуць дапамагчы пры гіпертаніі ванны з лекавымі травамі?***

— Ванны з лекавымі травамі можна прымаць як дапаможную тэрапію. З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца глог, сардэчнік, мята, меліса. Аднак неабходна вытрымліваць тэмпературны рэжым, пры якім тэмпература павінна быць не вышэйшая за 37 градусаў, а працягласць водных працэдур — 10—15 хвілін.

— Якой дыеты вы параілі б прытрымлівацца пры атэрасклерозе?

— Пры атэрасклератычным паражэнні сасудаў абавязкова трэба прытрымлівацца гіпахалестэрынавай дыеты. Абмяжоўваецца ўжыванне прадуктаў, багатых на жывёльныя тлушчы — сметанковае масла, тлустыя гатункі мяса, каўбаса, смятана, сыр і г.д. Пры пакупцы прадуктаў трэба звяртаць увагу на этыкетку, дзе ёсць інфармацыя аб утрыманні жывёльных тлушчаў. Ён павінен быць нізкім. Акрамя таго, у рацыён трэба ўключаць паболей агародніны і садавіны.

☎ ***— Орша, Святлана. У маці шмат гадоў язва 12-перснай кішкі. Лячылася. Болі прайшлі. Зараз двойчы на год праводзіць прафілактыку, але, карыстаючыся магчымасцю, хачу спытаць: ці праўда, што пры язве можна есці ў прынцыпе ўсё, але галоўнае — часта?***

— Не, гэта не так. Пры язвавай хваробе акрамя рэжыму харчавання трэба захоўваць дыету. Калі язва і гастрыт знаходзяцца ў перыядзе абвастрэння, неабходна выключыць усё, што раздражняе страўнік і павышае кіслотнасць. Найперш «агрэсіўныя» ў гэтым сэнсе сокі і фрукты — лімоны, апельсіны, грэйпфруты. Кіслотнасць павышаюць кетчуп і чорны хлеб, іх таксама не павінна быць у меню. Трэба адмовіцца ад вострага, вэнджанага, салёнага, кансерванага. Выключыць з рацыёну сырую садавіну і гародніну. Больш трэба ўжываць слізістых кашаў і кісялёў. Мяса, рыба, курыца — вараныя або тушаныя. А вось у перыяд рэмісіі прадуктамі, якія выключаліся падчас абвастрэння хваробы, проста нельга злоўжываць.

☎ ***— Клецк, Мікалай. У мяне гастрыт з павышанай кіслотнасцю. Прызнацца, даволі цяжка харчавацца правільна і прытрымлівацца рэкамендаванай мне дыеты. Сёлета, напрыклад, адпачываў у Турцыі. Зразумела, парушаў рэжым харчавання, з-за чаго адчуваў пякотку і рэзі. Што рабіць у такіх выпадках?***

— Пры наяўнасці такіх скаргаў вы перш за ўсё павінны прайсці абследаванне ва ўрача. Абавязкова прызначаецца фібрагастраскапія — даследаванне страўніка. Акрамя таго, у абвастрэнні гастрыту часта адыгрывае ролю не толькі парушэнне харчавання, а таксама хелікабактар пілары — бактэрыя, якая выклікае больш сур'ёзныя паражэнні, развіццё язвавай хваробы страўніка і 12-перснай кішкі. Таму, каб правільна прызначыць лячэнне, неабходна належным чынам абследавацца, а потым доктар вырашыць, якія лекі вам прызначыць. Можа быць, толькі прэпараты, якія зніжаюць кіслотнасць. А магчыма, спатрэбіцца спачатку вынішчыць хелікабактар пілары.

— І яшчэ. Зараз прадаецца шмат розных сродкаў ад дыскамфорту ў страўніку. Чым яны адрозніваюцца адзін ад аднаго?

— Кожная група прэпаратаў валодае сваімі ўласцівасцямі. Адны з іх могуць быць спазмалітычнымі, другія — абвалакваюць, трэція — нармалізуюць тонус страўніка, спрыяюць «эвакуацыі» ежы, павышаюць тонус катаральных мышцаў кардыяльнага аддзела страўніка. Прэпараты прызначаюцца пры дэталёвым абследаванні страўнікавакішачнага тракта і ў адпаведнасці з выяўленай паталогіяй. Калі гэта гастрыт з паніжанай кіслотнасцю, вам прызначаць адны лекі, калі з павышанай — іншыя. Калі сімптомы абумоўленыя наяўнасцю хелікабактара, то праводзіцца спецыфічная тэрапія. Таму, перш чым купляць прэпараты ад «дыскамфорту» ў страўніку, неабходна пракансультавацца з урачом.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе).

На слыху

ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ВЫРАТАВАЛІ 55 ТОН ЗБОЖЖА

У Шумілінскім раёне ў пасёлку Светласельскі гарэла збожжавая сушылка з 60 тонамі збожжавай сумесі ўнутры. Пажар пачаўся а сёмай гадзіне раніцы.

Як паведамілі «Звяздзе» ў абласным упраўленні МНС, сушылка айчыннай вытворчасці выраблена толькі летась. Працуе на прыродным газе. Па папярэдніх звестках прычына пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі цеплагенерыравальных агрэгатаў і прылад. Падраздзяленні МНС выратавалі ад агню 55 тон збожжа. Падчас пажару і яго тушэння канструкцыі сушылкі пашкоджаны не былі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АПОЎНАЧЫ ПАЧАЎСЯ ПАЖАР

у прамысловай краме цэнтра кааператыўнага ўчастка Лельчыцкага спажывецкага таварыства, які знаходзіцца ў пасёлку Глушкавічы.

Як расказаў прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, гарэла цаглянае памяшканне, плошча якога складае 100 квадратных метраў. У выніку знішчаны поўнасцю шыферны дах і прамысловыя тавары на суму 35 мільёнаў рублёў. Вартасць выратаваных таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў — 150 мільёнаў рублёў. Праводзіцца праверка. Папярэдняя версія здарэння — падпал.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НЯМЕЦКІ КАМБАЙН ЗАСТАЎСЯ БЕЗ ПАЛІВА

У Аршанскім раёне ноччу невядомыя скралі са збожжаўборачнага камбайна нямецкай вытворчасці 270 літраў дызельнага паліва, а таксама дзве фары і набор ключоў.

Машына стаяла на тэрыторыі механізаванага двара. А двор той, між іншым, ахоўваўся. Супрацоўнікі мясцовага аддзела ўнутраных спраў вызначылі, што крадзеж учынілі два беспрацоўныя 1990-га года нараджэння. Іх затрымалі. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ВЫЙСЦІ ПАСАЖЫРУ ДАПАМАГЛІ... ВЫРАТАВАЛЬНІКІ

У Наваполацку на вуліцы Кататорава «Нісан» урэзаўся ў жалезабетонны слуп асвятлення. Кіроўца не справіўся з кіраваннем. Было гэта а дзясятай гадзіне раніцы.

У выніку ДТЗ 25-гадовы пасажыр аўтамабіля быў заблакаваны ў салоне. Сядзеў ён побач з кіроўцам на пярэднім крэсле. Пры дапамозе спецыяльнага гідраўлічнага інструмента пасажыра вызвалілі з машыны, дзе яго сціснула, і перадалі медыкам з брыгады хуткай неадкладнай дапамогі. Яго шпіталізавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УКРАЎ ДЗВЮХ КАРОЎ

Жыхар вёскі Палонка Баранавіцкага раёна 1982 года нараджэння ўжо адбываў тэрмін пакарання за крадзеж. Але на свабодзе зноў узяўся за старое і з фермы вёскі Лотвічы ўкраў дзвюх кароў. Выкрадальнік затрыманы.

СЦЕРАЖЫСЯ РАКАВОЙ ЖАНЧЫНЫ

Жыхар горада Пінска з вуліцы Сухой заявіў у міліцыю, што ноччу падпалілі ўваходныя дзверы ў кватэру.

Выяўлена, што падпал учыніла грамадзянка 1972 года нараджэння, былая сужыцелька заяўніка 1980 года нараджэння. Цяпер яе шукае міліцыя. А ў вёсцы Крытышын Іванаўскага раёна любоўная драма «разгарэлася» яшчэ мацней. Кабета 1975 года нараджэння з рэўнасці падпаліла хату суперніцы 1985 года нараджэння. Вясковая жыхарка хавацца, як пінчанка, не стала, і яе затрымалі.

ХЛЕЎ НІЧНЫЙ — І ГАРЭЛКА НІЧЫЯ

У Маларыцкім раёне ля самай мяжы з Украінай супрацоўнікі міліцыі зазірнулі ў хлеў побач з закінутай нежылой пабудовай і знайшлі 117 бутэлек гарэлкі ўкраінскай вытворчасці, якія нехта прыхаваў. Тавар канфіскаваны.

Яна СВЕТАВА.

ТАЙНІКІ АБЯСШКОДЖАНЫ

Вялізны склад зброі схавалі чорныя капальнікі недалёка ад вёскі Кароткавічы Жлобінскага раёна.

Як расказаў начальнік упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю па Гомельскай вобласці Андрэй Заяц, яго супрацоўнікамі сумесна з групай размініравання вайсковай часці 5525 у лесе былі знойдзены боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны. Спіс нарытага ўнушальны: 3 артылерыйскія снарады, 12 гранат. А каля вёскі Плясавічы знаходзіўся яшчэ адзін тайнік, у якім былі трацілавыя мінныя шашкі па 200 грамаў кожная з запальнікамі — 23 штукі — і 82 мінныя запальнікі. Увесь «скарб» знішчаны на месцы, незаконных «археолагаў» шукае міліцыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 29.09.2009 г.

Фонд «Минскгоримущество» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска

	Лот №	1	2	3
1	**Наименование и местонахождение объекта, тип и характеристика помещения**	**Незавершенный строительством объект — «аптека в жилом доме № 1 по генплану. Микрорайон «Михалово-1»**	**Незавершенный строительством объект — «магазин непродовольственных товаров в 9-этажном крупнопанельном жилом доме со встроенными помещениями № 6 по генплану. Микрорайон «Михалово-1»**	**Незавершенный строительством объект — «продовольственный магазин в жилом доме № 35 по генплану. Застройка микрорайона «Сухарево-5» (III очередь строительства)»**
2	**Общая площадь* (м.кв.)**	266,50	907,05	1273,72
3	**Начальная цена продажи (руб.)**	284 023 471	1 144 387 089	1 319 560 212
4	**Сумма задатка (руб.)**	28 402 347	114 438 709	131 956 022
5	**Сроки оплаты объекта**	Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.		
6	**Характеристика строения**	Фундаменты – свайные с монолитным железобетонным ростверком; стены техподполья – монолитные железобетонные блоки серии Б1.016.1-1 из тяжелого железобетона; стены наружные – монолитные железобетонные и из газосиликатных блоков; стены внутренние – сборные железобетонные толщиной 500 мм, монолитный железобетон – 200 мм, кирпичные – 250 мм, газосиликат – 400 мм; перегородки – кирпичные 120 мм; перемычки – сборные железобетонные (серия Б 1.038.1-1), армированные брусковые (серия Б 1.038.1-3.02); перекрытие встроенных помещений – монолитное железобетонное толщиной 200 мм; полы – бетонные, линолеум, керамическая неглазурованная плитка; потолки – подвесные типа «Armstrong», подвесные из гипсокартона, клеевая покраска, известковая побелка. Степень готовности объекта по состоянию 01.05.2009 г. – 74 %.	Фундаменты – свайные с монолитным железобетонным ростверком под стены, свайные из забивных железобетонных свай, объединенных в свайный куст, со сборным или монолитным железобетонным стаканом под колонны; стены наружные – трехслойные, наружный и внутренний слои – кладка из эффективного кирпича СТБ 1160-99 на цементно-песчаном растворе, утеплитель – плиты пеностирольные ППТ 25Н-А СТБ 1437-2004; стены внутренние – бетонные блоксерии Б1.016.1-1 вып.1.98; перегородки – кирпичные и ячеистые блоки толщиной 120 мм; перекрытия – сборные железобетонные плиты из тяжелого бетона толщиной 16 мм; полы – линолеум на теплоизолирующей основе, плитка керамическая, бетон класса В25 F150; потолки – подвесные типа «Armstrong», улучшенная известковая побелка, улучшенная клеевая покраска. Степень готовности объекта по состоянию 01.05.2009 г. – 69 %.	Фундаменты – свайные безростверковые – жилая часть, с монолитными ростверками – встроенная часть; наружные стены техподполья – монолитные с утеплением встроенных помещений плитами «ПЕНОПЛЕКС» с последующим оштукатуриванием по сетке, внутренние – сборные железобетонные толщиной 160 мм; стены внутренние и перегородки из газосиликатных блоков толщиной 100 и 200 мм; перемычки – сборные железобетонные (серия Б1.038.1-1); перекрытие техподполья – сборные железобетонные плиты из тяжелого бетона толщиной 160 мм; перекрытие встроенных помещений – двойное из сборных железобетонных плит и из тяжелого бетона толщиной 160 мм; покрытия – сборные железобетонные плиты толщиной 160 мм из тяжелого бетона; кровля – двухслойная из наплавляемых материалов; полы – бетонные, линолеум на теплозвукоизолирующей подоснове, керамическая неглазурованная плитка, потолки – в торговом зале, кафе и служебных коридорах – подвесные типа «Armstrong», акриловая побелка, известковая побелка. Степень готовности объекта по состоянию 01.05.2009 г. – 69 %.
7	**Условия продажи объекта**	Сохранить функциональное назначение объекта. Возместить сверх цены продажи в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимость дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих затрат, понесенных заказчиком (УП «УКС Мингорисполкома») по строительству объекта после даты оценки до даты подписания акта приема–передачи. Возместить сверх цены продажи в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимость дополнительных проектно – изыскательских, строительно-монтажных и прочих работ по инженерным сетям, благоустройству и озеленению по состоянию на 01.05.2009 в сумме: 54 563 152 руб. – по лоту № 1; 123 025 473 руб. – по лоту № 2; 109 746 708 руб. – по лоту № 3; проиндексированных на дату их перечисления по индексам изменения стоимости строительно-монтажных работ по элементам затрат по г. Минску по ресурсно-сметным нормам (для работ, не освобождаемых от налога на добавленную стоимость). Компенсировать УП «УКС Мингорисполкома» затраты по выплате земельного налога с момента принятия объекта по акту приема-передачи до оформления правоустанавливающих документов на земельный участок. Компенсировать в бюджет г. Минска налог на добавленную стоимость (НДС) по состоянию на 01.05.2009, в том числе НДС на проектные работы и на строительно-монтажные работы. Сумма НДС уточняется на момент перечисления при возникновении дополнительных затрат по проектно-изыскательским, сметно-монтажным и прочим работам.		

** Сведения о площадях объектов, не завершенных строительством, даются на основании проектно-сметной документации.*

1). Аукцион состоится **29 сентября 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

2). Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность;
- представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;
- юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
- представители юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе представитель юридического лица должен представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие его полномочия на участие в аукционе и на подписание документов:

- руководитель юридического лица – документ о его назначении или избрании, а при необходимости – документ о его полномочиях, согласно уставу юридического лица;
- иные представители – доверенность, оформленную согласно учредительным документам юридического лица.

Физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности, удостоверенной нотариально) должно представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

- подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка в сумме 10 % начальной цены лота.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк», по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов по каждому лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится Покупателем.

Победитель аукциона в сроки, указанные в протоколе о результатах аукциона, обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов при заключительной регистрации под роспись.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **28 сентября 2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. **Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by**

У ПОШУКАХ РОДНАЙ МОВЫ

Што змянілася з мінулага года ва ўжыванні беларускай мовы ў гарадскім асяродку — весткі з Магілёва

Паблізу плошчы Зорак у цэнтры Магілёва ў гэтым сезоне з'явілася **новая летняя кавярня:** «Карчма на шклоўскім базары».

Драўляныя лаўкі і сталы, ільняныя абрусы — усё ў народным стылі, замест звыклай для вулічнага гандлю пластыкавай мэблі. Меню на летняй пляцоўцы — толькі на беларускай мове.

— Я не вельмі добра размаўляю па-беларуску, — усміхаецца ветлівая афіцыянтка, — Але, калі трэба, дапамагаю кліентам зразумець, дзе якая страва.

Хоць у пераважнай большасці выпадкаў наўрад ці патрабуюцца тлумачэнні, што такое «Шкварка беларуская», «Кілбаса крывяная», «Мачанка з блінамі» ды «Дранікі з грыбамі».

У дадатак да беларускіх прысмакаў — піва з прыватнага броварy, якое вырабляецца па чэшскай тэхналогіі. Беларускамоўнасць кавярні людзей зусім не адпужвае, хутчэй — наадварот.

Традыцыйна добра ставяцца да роднай мовы **транспартныя арганізацыі:** вакзальныя шыльды выраблены на беларускай мове, а прыпынкі ў аўтобусах і тралейбусах у Магілёве ўжо некалькі гадоў аб'яўляюць па-беларуску.

Магілёўская гарадская арганізацыя Таварыства беларускай мовы звярнулася да ўладаў абласнога цэнтра з прапановай змяніць музычны рэпертуар у грамадскіх месцах. Каб каля фантанаў гучаў не шансон, а беларуская музыка. У гарвыканкаме нібыта не супраць прапановы і даручылі актывістам ТБМ падрыхтаваць падборку музычных твораў.

